**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

**З гісторыі першага беларускага ордэна**

СТАР. 6

**Дыялог культур Беларусі і Туркменістана**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

25 ЛІПЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 138 (27748) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## З 1 ЖНІЎНЯ ПАВЯЛІЧАЦЦА ПРАЦОЎНЫЯ ПЕНСІІ

**У Беларусі з 1 жніўня павышаецца памер працоўных пенсій. Адпаведны ўказ № 366 «Аб павышэнні пенсій» 24 ліпеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«Указам прадугледжваецца правесці з 1 жніўня 2014 года карэкціроўку фактычнага заработку пенсіянераў і пераразлік працоўных пенсій», — праінфармавалі ў прэс-службе. У выніку з 1 жніўня 2014 года працоўныя пенсіі грамадзян павялічацца ў сярэднім на 7,3 працэнта.

■ Гарачая пара

## ЗА КАМБАЙНАМІ ІДУЦЬ КАСЦЫ

Уборку збожжавых плануюць завяршыць за 20 дзён

**«Я чалавек прымхлівы, таму дакладнай лічбы, якім будзе ўраджай збожжавых, называць не буду. Напрыклад, скажу 15 мільёнаў тон, а раптам атрымаецца менш?..», — кажа намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН. Дарэчы, летась было сабрана больш за 7,5 мільёна тон, а 15 мільёнаў — гэта зусім не жарт. Менавіта столькі, на думку старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА, і павінна максімальна атрымліваць наша краіна.**

### НЕ ТОЕ, ШТО РАНЕЙ...

Нядаўна **міністр сельскай гаспадаркі Леанід ЗАЯЦ** называў лічбу больш за 10 мільёнаў (з улікам кукурузы). Пажывём — пабачым... Прагнозы даволі аптымістычныя: сярэдняя ўраджайнасць пакуль складае 38,7 цэнтнера з гектара, а гэта на 8 цэнтнераў вышэй за леташнюю! Дарэчы, асобныя гаспадаркі ўмудраюцца атрымліваць ад 50 да 93 цэнтнераў з гектара.

Цяпер гэтыя лічбы здаюцца звычайнымі, а ўсяго нейкіх два дзясяткі гадоў таму беларусы збіралі па два-тры мільёны тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 10-12 цэнтнераў з гектара.

Дні для ўборкі зараз спрыяльныя. Убраць спелае збожжа з палёў (а гэта два з паловай мільёны гектараў) плануецца на працягу 20 дзён. Гэтаму паспрыяюць і 300 новых камбайнаў, якія на працягу тыдня паступяць у гаспадаркі. Каб у полі не прапала ніводнага зярнятка, на Брэстчыне за камбайнам, асабліва ў тых месцах, дзе каласы палеглі ад непагадзі і шквалістага ветру, ідуць касцы. Толькі за 23 ліпеня было ўбрана 90 тысяч гектараў. Каб паспець у тэрмін, трэба ўбіраць у сярэднім па 100-120 тысяч тон за дзень. Тэмпы ўборкі вырастуць, як толькі актыўна падключыцца Віцебшчына, якая традыцыйна выйшла на палі на два тыдні пазней. Ёсць ужо і першыя камбайнеры-тысячнікі. Так, экіпаж Васіля Коваля агракамбіната «Холмеч» Гомельскай вобласці намалаціў 1620 тон збожжа.

Ісці на рэкорды дазваляе дасканалае выкананне тэхналогіі, больш сучасны транспартны парк, правільная структура пасяўных плошчаў.

СТАР. 2




## Ах, як пахнуць гаючыя травы!

*У саўгаса «Вялікае Мажэйкава» Шчучынскага раёна пара цяпер не толькі гарачая, але і... духмяная. Больш за пяцьдзесят гадоў прадпрыемства спецыялізуецца на вырошчванні лекавых зёлак: рамонку, календулы, валяр'яны і сардэчніка. Гэта, дарэчы, адзінае ў краіне прадпрыемства, дзе гаючыя зёлкі вырошчваюць у прамысловым маштабе.*

Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр ГОРВАЛЬ, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры:**

*«У першым паўгоддзі ў краіне ўведзена ў эксплуатацыю 2 млн 709,5 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля, што складае 54,2% да прадугледжанага задання на год і на 8,6% перавышае адпаведны ўзровень 2013 года. З выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 1 млн 205,6 тыс. кв.м жылля для тых, хто мае патрэбу, з запланаваных на год 2,5 млн кв.м. Уведзена 96,9 тыс. кв.м (1754 кватэры) арэндnага жылля з гадавога плана ў аб'ёме 320 тыс. кв.м. Па дзяржзаказе пабудавана 12 шматкватэрных жылых дамоў, але асноўны ўвод запланаваны на 3-4-ы кварталы. Пры гэтым засталіся недабудаванымі 7 праблемных дамоў — 3 у Мінскай вобласці і 4 — у Мінску. На другое паўгоддзе ёсць пэўныя праблемы з інвеставаннем. Яны зараз разглядаюцца на ўзроўні ўрада, і будзе знаходзіцца рашэнне».*

# ПЕРШЫЯ ЗРУХІ

Да канца лета ў Полацку на месцы масавага пахавання ахвяр Вялікай Айчыннай вайны з'явіцца агароджа

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»

«Урочышча Пяскі»

**Гэты праект стартаваў у кастрычніку мінулага года. Восем публікацый, чатыры камандзіроўкі, размовы са сведкамі, «круглы стол», дзясяткі пісем... Дзеля таго, каб гістарычная справядлівасць перамагла. Каб агульная магіла дзясяткаў тысяч савецкіх ваеннапалонных, падпольшчыкаў, партызанаў і мірных жыхароў Полаччыны была, нарэшце, добраўпарадкавана, набыла выгляд, годны памяці тых, хто там ляжыць. З ініцыятарам праекта, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталляй ГУЙВІК наша размова пра першыя зрухі ў гэтым накірунку.**

***— Наталля Васільеўна, якія галоўныя навіны сумеснага праекта газеты «Звязда» і грамадскасці Полаччыны па стварэнні мемарыяла «Урочышча Пяскі»?***

— Пастанаўленнем Савета Міністраў ад 4 чэрвеня 2014 года №534 зацверджана Дзяржаўная праграма на 2015—2020 гады па ўвекавечанні загінулых абаронцаў Айчыны і захаванні памяці пра ахвяр вайны. У гэтай праграме прадугледжана заканчэнне будаўніцтва мемарыяльнага комплексу «Урочышча Пяскі» ў горадзе Полацку ў 2015—2017 гадах, заказчыкам з'яўляецца Віцебскі аблвыканкам, крыніца фінансавання — мясцовы бюджэт. Гэта — галоўная навіна і несумненная наша агульная перамога. Дзяржава прызнала неабходнасць дапамогі ў будаўніцтве гэтага мемарыяла.

***— Колькі грошай ужо сабрана на будаўніцтва мемарыяла?***

— На дабрачынны рахунак ад прыватных асоб і арганізацый з ліпеня 2010-га па ліпень 2014-га года было пералічана звыш 600 млн беларускіх рублёў, таксама 180 млн выдаткаваў Віцебскі аблвыканкам і 300 млн — Полацкі райвыканкам. Пасля старту сумеснага праекта з газетай «Звязда» на рахунак паступіла 150 млн рублёў. Па маёй просьбе правядзенне дабрачыннай акцыі па стварэнні мемарыяла падтрымала адміністрацыя расійскага горада Электросталь (пабраціма Полацка).

СТАР. 2

Дзед Вольгі Грышчанкі (на фота яна разам са сваімі ўнучкамі) Радзівон Пілюгін 70 гадоў лічыўся прапаўшым без вестак. Полацк, урочышча Пяскі, 9 мая 2014 года.

## СПЯКОТА ЗАХАВАЕЦЦА ДА КАНЦА ЛІПЕНЯ

**Пра гэта БЕЛТА паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 11-17 градусаў, у дзённыя гадзіны паветра прагрэецца да 24-29 градусаў. Ноччу месцамі па Віцебскай вобласці, днём у асобных раёнах краіны чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы.

«У гэтыя выхадныя надвор'е па-ранейшаму будзе знаходзіцца пад уплывам цёплага антыцыклону, што перамяшчаецца са Скандынаўскага паўвострава праз Эстонію на Смаленскую вобласць», — адзначыла Людміла Парашчук. У сувязі з гэтым будзе пераважна без ападкаў, а паўднёва-ўсходні вецер прынясе ў Беларусь яшчэ больш цёплае паветра. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 12-19 градусаў, удзень чакаецца ад 26 да 32 градусаў вышэй за нуль. «Такі тэмпературны фон на 4-7 градусаў перавысіць кліматычную норму», — дадала галоўны сіноптык.

Гарачае надвор'е захаваецца ў Беларусі і ў апошнія дні ліпеня. З панядзелка па чацвер тэмпература паветра ноччу складзе плюс 14-20 градусаў, удзень прагназуецца ад 26 да 33 градусаў цяпла. Пры гэтым будзе пераважна без ападкаў, толькі ў заходніх раёнах, дзе пад уплывам маларухомага атмасфернага фронту, які знаходзіцца на тэрыторыі Польшчы, магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10290,00 | ■ |
| Еўра | 13850,00 | ■ |
| Рас. руб. | 293,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 879,11 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +26° |
| Віцебск | +25° |
| Гомель | +25° |
| Гродна | +26° |
| Магілёў | +25° |
| Мінск | +25° |

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### САМАЛЁТ AIR ALGERIE ЎПАЎ КАЛЯ СТАЛІЦЫ НІГЕРА

Самалёт авіякампаніі Air Algerie, які знік з радараў учора раніцай, як мяркуецца, разбіўся каля сталіцы Нігера — горада Ніямей. Сувязь з авіялайнерам DC-9 была страчана праз 50 хвілін пасля вылету з аэрапорта сталіцы Буркіна-Фасо. Самалёт здзяйсняў рэйс Уагадугу — Алжыр. На яго борце знаходзіліся 110 пасажыраў і шэсць членаў экіпажа.

### ЛІТВА ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ЕЎРА З 1 СТУДЗЕНЯ 2015 ГОДА

Савет Еўрасаюза ў Бруселі прыняў канчатковае рашэнне аб далучэнні Літвы да зоны еўра з 1 студзеня 2015 года. «Мы прынялі рашэнне вітаць Літву з 2015 года ў якасці 19-га члена еўразоны, — заявіў італьянскі міністр па еўрапейскіх справах Сандра Гозі. — Літва будзе не проста новым членам еўразоны, але будзе вельмі надзейным яе членам, паколькі фінансава-эканамічныя працэсы ў Літве такія, што іх можна прыводзіць у прыклад». Па словах Гозі, бліжэйшыя паўгода краіна павінна выкарыстаць для належнай падрыхтоўкі да пераходу на агульнаеўрапейскую валюту. Як пастанавіў Савет ЕС, курс нацыянальнай валюты ў адносінах да еўра пры ўступленні Літвы ў еўразону застанецца ранейшым — 3,4528 літа за адзін еўра.

### АРЭХІ ПРАДУХІЛЯЮЦЬ ЗАХВОРВАННІ СЭРЦА

Сардэчна-сасудзістыя захворванні з'яўляюцца асноўнай прычынай смерці ва ўсім свеце. Даследаванне ўніверсітэта навукі і тэхналогіі Хуа Чжун у Кітаі і Гарвардскай школы грамадскага здароўя паказала: ужыванне арэхаў можа знізіць рызыку ўзнікнення захворванняў сэрца амаль на трэць, перадае The Huffington Post. Эксперты выявілі, што штодзённая порцыя арэхаў зніжала рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў на 28-29%. Небяспека смерці ад любых іншых захворванняў таксама памяншалася на 17%. Арэхі неістотна ўплываюць толькі на рызыку развіцця дыябету і інсульту. У арэхах змяшчаюцца вітаміны, мінералы і ненасычаныя тлустыя кіслоты, якія зніжаюць узровень халестэрыну і памяншаюць запаленне ў арганізме. Раней Гарвардскай школай грамадскага здароўя было праведзена даследаванне аб уплыве арэхаў на рак падстраўнікавай залозы. У жанчын, якія елі жменю арэхаў два разы на тыдзень і часцей, рызыка развіцця раку падстраўнікавай залозы была на 35% ніжэйшая ў параўнанні з тымі, хто арэхаў не еў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАДА УКРАІНЫ ЗАПУСЦІЛА ПРАЦЭС РОСПУСКУ

Спікер украінскага парламента Аляксандр Турчынаў на пасяджэнні 24 ліпеня абвясціў аб роспуску фракцыі Камуністычнай партыі Украіны ў Вярхоўнай радзе, паведамляе «Украінская праўда». «Гэта гістарычная падзея. Я спадзяюся, што ніколі больш камуністычных фракцый ва ўкраінскім парламенце не будзе», — таксама сказаў спікер Рады. Распусціць фракцыю камуністаў парламенту дазволіў падпісаны напярэдадні прэзідэнтам закон, згодна з якім старшыня парламента надзяляецца правам распусціць дэпутацкую фракцыю, склад якой налічвае менш вызначанай мінімальнай колькасці народных дэпутатаў. У Кіеве не ўтойвалі, што прынялі закон спецыяльна для роспуску фракцыі КПУ. Напярэдадні апаненты лідара КПУ Пятра Сіманенкі ў Вярхоўнай Радзе бесцырымонна выштурхалі яго з залы пасяджэнняў. Тым часам парламенцкія фракцыі «УДАР» і «Свабода» выйшлі з каліцыі большасці ў Вярхоўнай радзе Украіны. Такім чынам яны запусцілі працэс роспуску парламента і абвяшчэння пазачарговых выбараў.

КАРАТКА

**Вядомае міжнароднае выданне аб банкаўскай індустрыі і фінансавых рынках The Banker апублікавала штогадовы рэйтынг «1000 буйнейшых банкаў свету». Беларусбанк палепшыў сваю пазіцыю, узняўшыся з 412-га месца на 399-е, і па-ранейшаму застаецца адзіным беларускім банкам у верхняй палавіне рэйтынгу.**

Беларусь 23 ліпеня ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэнд-бай МВФ ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 54,7 млн СДР, што эквівалентна $84,4 млн.

**ЗША на парытэтнай аснове знізілі кошт віз для грамадзян Беларусі. З 1 чэрвеня 2014 года ўстаноўлены адзіны консульскі збор за разгляд хадайніцтваў аб выдачы грамадзянам ЗША ўязных віз усіх тыпаў і кратнасці ў памеры $160.**

Беларусы змогуць атрымліваць пасылкі коштам да 200 еўра без аплаты пошлін з 25 кастрыніка.

## РУПЛІЎЦАМ МОВЫ І ЗЯМЛІ ПАДАРУНАК АД «ЗВЯЗДЫ»

**Выснова не з новых: найбольшае дасягненне газеты «Звязда» — ну вядома ж — яе чытачы!**

**Пасля ўручэння чарговага з прызоў гэтую фразу можна смела дапоўніць кароткім: «...і іх дзеці», бо проста цуд якой дзяўчыне аддалі днямі сушылку для агародніны!**

Прыгажуня, гумарыстка, студэнтка, можна сказаць, без пяці хвілін архітэктарка — Зінаіда Ляшонак расказала (і, да гонару, на вельмі добрай беларускай мове!), што «Звязду» пастаянна выпісваюць яе бацькі, што матуля працуе ў Глыбоцкай гімназіі намесніцай дырэктара па вучэбнай працы, а бацька — у мясцовых электрасетках (прыносіць, так бы мовіць, святло ў хаты людзей); што жыве іх дружная сям'я ў прыватным доме, што прыім ёсць сад, пабудовы і, як у тога пана Быкоўскага, «з паўвалочкі» зямлі... Што, на вялізазны жаль, пайшоў з жыцця яе дзядуля — вядомы паэт Тамаш Ляшонак, але ж, дзякаваць Богу, жывыя ўлюбёныя бабулі — Зінаіда і Німфадора, што абедзве яны — таксама не беззямельныя. А значыць, звяздоўская сушылка для агародніны — гэта тое, што трэба!..

Мы пашкадавалі, што ў рэдакцыі няма вялікага пакета, каб пакласці яе, — зручней было б несці...

Зінаіда адказала, што абыдзецца: што вось так, на плячы, панясе наш прыз аж да дома: «Раптам з хлопцаў хто дапаможа?»

І, як падалося, той ніколі не пашкадуе! Прынамсі, які-ніякі пасаг з падачы «Звязды» ў дзеўкі ўжо ёсць... Апроч многага, многага іншага...

**Валянціна ДОЎНАР.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

# ПЕРШЫЯ ЗРУХІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інфармацыя пра гэта размешчана на афіцыйным сайце горада, у СМІ. Кіраўнікам гарадскіх прадпрыемстваў Электрасталі былі разасланы пісьмы з просьбай падтрымаць ініцыятыву брацкага народа па ўвекавечанні памяці ахвяр фашызму. У выніку на рахунак Віцебскага аддзялення Беларускага фонду міру сталі паступаць расійскія грошы, на сёння іх каля 70 тысяч рублёў. Такім чынам за гэты час сабрана больш за 1 млрд беларускіх рублёў.

***— Гэта пятая частка ад патрэбнай сумы?***

— Так, усяго патрэбна каля 5 млрд рублёў. Уключэнне ў Дзяржаўную праграму — вельмі добрая навіна, але было б надзвычай лагічна адкрыць мемарыял 9 мая 2015 года, у дзень 70-годдзя Перамогі. Мы будзем хадайнічаць пра выдзяленне сродкаў з вобласці на наступны год, і разам з тым працягваем збор дабрачынных грошай. Вельмі хочацца падзякаваць жыхарам горада Наваполацка, якія за апошні год сабралі каля 200 млн рублёў. Значная заслуга ў гэтым старшыні гарвыканкама, сенатара Наталлі Качан, якая падтрымала стварэнне мемарыяла. Жыхары Полацка былі найбольш актыўнымі ў 2010 і 2011 гадах, і калі б не інфляцыя, мы б ужо пабудавалі мемарыял.

***— Нагадайце, колькі там можа быць пахавана людзей?***

— Дакументальна (згодна з пашпартам пахавання) пацверджана знаходжанне там астанкаў 38 тысяч савецкіх ваеннапалонных нямецкага перасыльнага лагера «Дулаг-125».

Аднак у акце надзвычайнай камісіі па ўсталяванні і расследаванні фактаў злачынстваў і зверстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі ў перыяд часовай акупацыі з 15 ліпеня 1941 года па 4 ліпеня 1944 года ў горадзе Полацку, маецца наступная інфармацыя:

«Мірных савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, у тым ліку хворых, асобы з нямецкага гестапа вывозілі на аўтамашынах на палігон 15 стралковага палка (урочышча Пяскі. — «Зв.») і сотнямі штодня расстрэльвалі. Адначасова праводзіліся масавыя расстрэлы мірных савецкіх грамадзян і ваеннапалонных на тэрыторыях лагераў. Забойствы ў асноўным былі праз расстрэл тыповым нямецкім прыёмам — стрэлам у патыліцу.

На тэрыторыі, якая прылягала да лагера, немцы рабілі масавыя пахаванні і потым спальванне трупаў. Большую частку трупаў немцы спальвалі на палігоне 15 стралковага палка. Усяго было спалена больш за 150 000 чалавек мірных савецкіх грамадзян і зняволеных».

Гэты дакумент датаваны 7 мая 1945 года. Інфармацыя ў ім грунтуецца на шматлікіх паказаннях сведак, савецкіх грамадзян, якія знаходзіліся ў лагерах, і відавочцаў зверстваў.

Дарэчы, 3 ліпеня гэтага года, падчас свята ў гонар вызвалення горада Полацка, да мяне падышла палачанка і папрасіла сустрэцца з яе бацькам, мама і тата якога ў гады акупацыі былі расстраляныя гестапа. Гэты чалавек упэўнены, што расстралялі іх ва ўрочышчы Пяскі, бо менавіта там звычайна адбываліся забойствы гараджан.

***— Ці адноўлены работы па будаўніцтве мемарыяла?***

— Цяпер на сабраныя сродкі вядуцца земляныя работы. Там ужо ёсць Сцяна памяці з усталяванымі імёнамі ахвяр, якія знайшлі спачын у гэтым месцы. Цяпер адбываецца вертыкальная планіроўка. Да канца лета плануецца ўсталяваць агароджу па перыметры 70 на 150 метраў. Работы курыруе намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па архітэктуры і будаўніцтве Аляксандр Міхалевіч.

Дагэтуль косці савецкіх салдат можна знайсці на паверхні зямлі ва ўрочышчы Пяскі. Фота зроблена падчас мітынгу ў Дзень Перамогі 2014 года.

На жаль, дагэтуль дажджы размываюць косці пахаваных там людзей. 9 мая гэтага года ў памятным мітынгу на тэрыторыі ўрочышча Пяскі ўдзельнічала жыхарка расійскага горада Падольска Вольга Грышчанка, унучка Радзівона Пілюгіна, які па інфармацыі абагульненага камп'ютарнага банка звестак «Мемарыял» памёр у нямецкім лагеры «Дулаг-125» у студзені 1944 года. Вольга Сяргееўна прыехала разам з дачкой і ўнучкамі — на магілу Радзівона Пілюгіна ўпершыню прыйшлі нашчадкі ў другім, трэцім і чацвёртым пакаленні.

**На пытанне дзяўчынак, чые гэта косці, жанчына адказала: «Магчыма, вашага прапрадзеда...» Такое не павінна адбывацца.**

Больш за семдзесят гадоў сям'я нічога не ведала пра яго лёс, толькі ў 2014 годзе ўнучка даведалася, дзе пахаваны дзед і куды можна прыйсці і пакланіцца яму. Пасля мітынгу і ўскладання кветак ля Сцяны памяці Вольга Мікалаеўна разам з дачкой і ўнучкамі прайшлася па тэрыторыі ўрочышча і ўбачыла чалавечыя косці. На пытанне дзяўчынак, чые гэта косці, жанчына адказала: «Магчыма, вашага прапрадзеда...» Такое не павінна адбывацца, і мы, жыхары Полаччыны, разам з усімі нашчадкамі салдат той вайны, павінны пра гэта паклапаціцца.

У жніўні плануецца візіт у Полацк нашых сяброў з нямецкага горада-пабраціма Фрыдрыхсхафена, якія, па іх словах, сабралі 8 тысяч еўра на будаўніцтва мемарыяла. Яны жадаюць заключыць дагавор на будаўніцтва канкрэтнага элемента мемарыяла, каб відавочна абазначыць свой уклад у загладжванне віны сваіх бацькоў і дзядоў перад тымі, хто назаўсёды застаўся ляжаць у беларускай зямлі.

***— Якая работа праводзіцца па аднаўленні імёнаў пахаваных ва ўрочышчы Пяскі?***

— Удзельнікі «круглага стала», які прайшоў у рэдакцыі газеты «Звязда» (публікацыя за 10 мая 2014 года) і быў прысвечаны мемарыялу, распрацавалі канкрэтны план мерапрыемстваў, які прадугледжвае, у тым ліку, збор інфармацыі пра ваеннапалонных «Дулага-125» і пошук іх сваякоў.

Куратар праекта «Дулаг-125» у Расійскай Федэрацыі Рыгор СКВАРЦОЎ, Вольга ГРЫШЧАНКА (другая злева) з дачкой і ўнучкамі і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Наталля ГУЙВІК (першая справа) ля Сцяны памяці ва ўрочышчы Пяскі. Полацк, 9 мая 2014 года.

Вырашана распрацаваць сайт, дзе будзе размешчана ўся інфармацыя, якая датычыцца ўрочышча Пяскі. Мы спадзяёмся, што ў гэтым нам дапаможа Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Прарэктар Дзяніс Дук, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Наталля Лысава і загадчыца кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Алеся Корсак пацвердзілі зацікаўленасць універсітэта ў рабоце з дакументамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусі на нямецкай мове. Работа па аднаўленні імёнаў пахаваных ва ўрочышчы Пяскі не закончыцца і пасля стварэння мемарыяла. Наша задача — яе пачаць.

Спадзяёмся на дапамогу італьянскага пасольства ў пошуку сваякоў італьянскіх ваеннапалонных, якія загінулі ў полацкім лагеры. Нам вядомыя пяць прозвішчаў італьянскіх вязняў «Дулага-125»: у 1993 годзе ва ўрочышчы былі знойдзены форменныя гузікі з мундзіраў італьянскіх салдат, а сёлета ў Полацку знайшлі салдацкі кацялок часоў Другой сусветнай вайны з надрапаным на ім распаўсюджаным італьянскім прозвішчам «Castello».

Мы папрасілі таксама пасольства Расіі звярнуцца да кіраўнікоў тых расійскіх рэгіёнаў, дзе фарміраваліся злучэнні 22-й арміі, якія ўдзельнічалі ў баях на Віцебшчыне летам 1941 года. Большая частка тых 38 тысяч ваеннапалонных, што пахаваны ў Пясках, былі ваеннаслужачымі злучэнняў 22-й арміі, якія фарміраваліся ў Башкартастане, Удмурціі, Пермскай, Чалябінскай, Маскоўскай, Смаленскай, Цвярской (тады Калінінскай), Варонежскай і Свярдлоўскай абласцях. У мясцовых архівах могуць захоўвацца спісы прызыўнікоў 1939-1941 гадоў, што значна дапамагло б у пошуку сярод іх ахвяр полацкага лагера. З 38 тысяч дакладна пахаваных у Пясках салдат мы сёння ведаем толькі 102 прозвішчы.

Яшчэ адна прапанова ўдзельнікаў «круглага стала» — стварыць міжнародную рабочую групу па вывучэнні архіўных дакументаў, звязаных з акупацыйным рэжымам у Полацку ў 1941—1944 гадах. Падобная рабочая група створана нямецкімі і расійскімі гісторыкамі. Ёсць звесткі, што ў тую вайну каля аднаго мільёна савецкіх грамадзян прапалі без вестак. Мы не павінны з гэтым мірыцца, неабходна зрабіць усё магчымае, каб даведацца пра лёс гэтых людзей і годна ўшанаваць іх памяць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Грошы на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» можна пералічваць у Віцебскае абласное аддзяленне ГА «Беларускі фонд міру» на рахунак**

**№ 3135411066036 (у беларускіх рублях), № 3135411066502 (у доларах), № 3135411066805 (у расійскіх рублях)**

**у дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, 153001739, УНП 300126736**

# ЗА КАМБАЙНАМІ ІДУЦЬ КАСЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ужо здадзена 60% збожжа па дзяржзаказе. Лідзіруе Брэсцкая вобласць, якая раней за ўсіх выйшла на палі. «Сёлета ўдалося павялічыць закупачную цану на піваварны ячмень, — праінфармаваў Уладзімір Гракун. — Было цяжка пераканаць канцэрн «Белдзяржхарчпрам». Цяпер тона ў залежнасці ад якасці каштуе ад 2 мільёнаў да 2 мільёнаў 600 тысяч рублёў. 150 тысяч тон збожжа, якое плануецца сабраць, павінна хапіць для нашых прадпрыемстваў».

## ШМАТ ЧАМУ НАВУЧЫЛІСЯ

Гэты год атрымаўся не кукурузны. З самай вясны пасевы не цешылі аграрыяў. Падкормкі, хімпраполкі дапамаглі кукурузе пайсці ў рост. Аднак пра аддачу гаварыць пакуль рана.

Тое ж самае можна сказаць пра бульбу. Яе плануецца ўбраць каля 1 мільёна 600 тон. З улікам таго, што дапамогуць фермеры. Пакуль рана казаць пра ўраджайнасць, але стан і развіццё культуры добрыя.

**Усяго нейкія два дзясяткі гадоў таму беларусы збіралі па два-тры мільёны тон збожжа.**

Ідзе ўборка, якая сёлета таксама ранняя, азімага рапсу. Ураджайнасць нядрэнная — больш за 22 цэнтнеры з гектара. З 416 тысяч гектараў перазімавала 360 тысяч: значыць, загінула не больш за дзесяць «нарматыўных» працэнтаў.

Сёння ідэальныя ўмовы для льну: ідзе яго цярабленне. Брэсцчына практычна завяршыла гэтую працу. Ураджайнасць атрымалася вельмі добрая. Да 15 верасня лён цалкам плануецца ўбраць.

Летась было небагата яблыкаў. У гэтым жа годзе новыя сады плошчай 17 тысяч гектараў (усяго іх каля 43 тысяч) павінны забяспечыць патрэбы беларусаў і даць частку экспарту. «Вы заўважылі, якія прыгожыя, таварныя яблыкі айчыннай вытворчасці ў апошні час з'явіліся на прылаўках?» — адзначае з гонарам намеснік міністра.

Пра тое, што нашы аграрыі шмат чаму навучыліся за апошнія гады, сведчыць адно істотнае назіранне. Уладзімір Гракун асабіста бачыў у маскоўскім універсаме, як прадавалі беларускую бульбу пад выглядам галандскай, а айчынныя яблыкі выдавалі за польскія.

Аднак многія пытанні яшчэ патрабуюць вырашэння. Нездарма кіраўнік дзяржавы нядаўна падпісаў чатыры ўказы. Згодна з адным з іх плануецца рэарганізаваць калгасы: СВК пераўтворацца ў гаспадарчыя таварыствы або камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы. Ужо запланавана вучоба эканамістаў гаспадарак.

**Лана РУЖАНСКАЯ.**

■ На кантролі

# ПРАВЕРКІ ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ ПАРУШЭННІ

**Пакуль аграрыі працягваюць жніво, кантралёры праводзяць маніторынг уборачнай кампаніі. У Камітэце дзяржкантролю Гомельскай вобласці расказалі аб першых выніках.**

8 сельгасарганізацый Веткаўскага і Лоеўскага раёнаў трапілі ў поле зроку. У адной з іх выяўлена скажэнне аператыўнай справаздачнасці, у трох — непадрыхтаванасць складскіх памяшканняў і сушылак, у шасці — вагавай гаспадаркі. Так, у СВП «Свяцілавічы» Веткаўскага раёна сказілі аператыўную справаздачнасць пра колькасць намалочанага рапсу — завысілі ў аператыўнай інфармацыі на 08.07.2014 амаль на 30 тон, ці амаль 68% ад фактычна атрыманага.

У КСУП «Хальч» адно са збожжасховішчаў не было падрыхтавана да прыёмкі збожжа, а ў ЧСУП «Лоеўскага раёна не быў завершаны рамонт адзінай зернесушылкі СКУ-10. У КСУП «Бывалькі» гэтага ж раёна ўраджайнасць рапсу склала 11 ц/га, што на 39% ніжэй за сярэднюю па вобласці. Высветлілася, што апрацоўка пасеваў рапсу фунгіцыдамі і сродкамі ад лопання струкоў у гаспадарцы не праводзілася. Пра вынікі маніторынгу Камітэт дзяржкантролю вобласці праінфармаваў Гомельскі аблвыканкам для прыняцця аператыўных захадаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■

# ДАВЕДКА ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**У магіляўчан з'явілася магчымасць аператыўна замаўляць шэраг даведак, не выходзячы з дому.**

Трэба толькі зайсці на сайт Магілёўскага цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм, запоўніць спецыяльную форму і пакінуць свой нумар тэлефона. Дакумент можна будзе атрымаць у разлікова-касавым цэнтры ўжо на наступны дзень, трэба толькі не забыць дома пашпарт.

— Гэтая паслуга вельмі запатрабаваная, — адзначыла **дырэктар ЦГІС Алена БАЛЬШАКОВА.** — Анлайн-заяўка даведак дазволіць жыхарам горада аператыўна і без чаргі атрымліваць неабходныя дакументы, а спецыялістам разлікова-касавых цэнтраў (іх у Магілёве 5) — рацыянальна размяркоўваць свой працоўны час.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Абітурыент-2014

# УСКОЧЫЦЬ У АПОШНІ ВАГОН

## У тых, хто хоча стаць студэнтам, яшчэ ёсць магчымасць трапіць на «бюджэт»

**У Беларусі распачаўся дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы, якія засталіся незапоўненымі пасля першай, асноўнай, хвалі залічэння абітурыентаў.**

Напрыклад, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт дабірае абітурыентаў па трох спецыяльнасцях: «Матэматыка. Інфарматыка», «Фізіка. Інфарматыка» і «Пачатковая адукацыя» — усяго 68 чалавек.

Мазырскаму педагагічнаму ўніверсітэту таксама не ўдалося ўкамплектаваць спецыяльнасці «Матэматыка і інфарматыка», «Прыкладная матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Пачатковая адукацыя» і «Прафесійная адукацыя».

У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце засталіся незапоўненыя месцы на спецыяльнасцях «Машыны і абсталяванне для ляснога комплексу» (6), «Хімічная тэхналогія апрацоўкі драўніны» (16) і «Біяэкалогія» (8).

БНТУ дадаткова набірае абітурыентаў на бюджэтныя месцы па спецыяльнасцях «Тэхналагічнае абсталяванне машынабудаўнічай вытворчасці» (5 чалавек), «Металургічная вытворчасць і матэрыялаапрацоўка» (12 чалавек), «Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне» (9 чалавек), «Шматфункцыянальныя гусенічныя і колавыя машыны» (11 чалавек).

У Інстытуце пагранічнай службы недабор склаў 21 чалавек. БДУ запрашае яшчэ 4 абітурыентаў на ваенны факультэт на спецыяльнасць «Хімія» (накірунак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона).

У Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры трэба запоўніць 12 месцаў.

У Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце дадатковы набор закрануў аж 10 спецыяльнасцяў, у тым ліку такія, як «Метралогія, стандартызацыя і сертыфікацыя», «Праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі», «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасці», «Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне АПК», «Энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі» і іншыя.

А ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі незапоўненымі засталіся 16 спецыяльнасцяў. Тут дабіраюць 361 чалавека, але 227 месцаў прызначаны для «мэтавікаў».

Працягваецца набор і на бясплатныя месцы ў Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО». Сёлета тут выдзелена 80 бясплатных месцаў для самых паспяховых абітурыентаў: ад 10 да 15 месцаў на ўсіх спецыяльнасцях дзённай формы навучання. Прэтэндаваць на бясплатныя месцы могуць усе абітурыенты з агульным балам 250 і большым.

Прэтэндаваць на вакантныя бюджэтныя месцы дзяржаўных ВНУ могуць абітурыенты, якія паступалі на іншую спецыяльнасць або ў іншую ВНУ, але не прайшлі там па конкурсе. Таксама да конкурсу на вакантныя месцы дапускаюцца і абітурыенты, якія не набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні вызначаную мінімальную колькасць балаў. Для іх парог зніжаны на пяць балаў. Гэта значыць, што ў сертыфіктах па беларускай і рускай мове яны павінны мець 5 балаў і больш. Па матэматыцы, фізіцы, хіміі, і біялогіі — 10 балаў і больш. А па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі, замежных мовах — 15 балаў і больш.

Для абітурыентаў, якія паступаюць у рамках дадатковага набору на ваенныя, спартыўныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, дастаткова мець у сертыфікаце ўсяго 3 балы. Прычым гэта тычыцца ўсіх экзаменацыйных дысцыплін цэнтралізаванага тэсціравання: рускай і беларускай мовы, матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўства, геаграфіі і замежных моў.

Тэрміны прыёму дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы на ваенныя спецыяльнасці — да 25 ліпеня, у «творчых» ВНУ — 27-28 ліпеня, а ва ўсіх астатніх ВНУ — з 23 па 28 ліпеня.

Больш падрабязную інфармацыю пра дадатковы набор абітурыенты могуць знайсці на інтэрнэт-сайтах вышэйшых навучальных устаноў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Чулі?

# ЗААХВОЦІЦЬ РУБЛЁМ

**У Мінску спецыялістаў ЖЭСа плануюць стымуляваць павышэннем заробкаў.**

Каб павысіць прэстыж прафесій у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у сталіцы плануюць павялічыць заробкі супрацоўнікам ЖЭСаў. Так, міркуецца, што зарплата начальніка ЖЭСа будзе складаць не менш за 10 млн рублёў (цяпер яна складае каля 7 млн). Падняць заробкі плануецца і тым, хто займаецца бытавым абслугоўваннем насельніцтва: рабочым па комплексным прыборцы тэрыторый, сантэхнікам і іншым супрацоўнікам жыллёва-эксплуатацыйнай службы.

— Час ставіць перад намі неабходнасць такіх захадаў, бо мы маем дэфіцыт кадраў — дворнікаў, слесараў, — распавёў «Звязде» **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК.**

Спецыяліст дадаў, што пакуль казаць пра канкрэтныя тэрміны павышэння заробкаў рана, адзначыўшы, што яно адбудзецца, «калі на гэта будуць сродкі».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■


**ОАО «Амкодор-Дзержинск»**

222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19

**Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров**

**Собрание состоится 6 августа 2014 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, кабинет директора Общества.**

Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 25 июля 2014 г.

**Повестка дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Амкодор-Дзержинск» за счет источников собственных средств.
2. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Амкодор-Дзержинск».
3. Об увеличении уставного фонда ОАО «Амкодор-Дзержинск» путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки.
4. О досрочном прекращении полномочий члена Совета директоров Общества и доизбрании нового члена Совета директоров.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 23 июля 2014 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 29 июля 2014 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 600005769

***Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»***



ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

**с 26 августа 2014 г.**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 | Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 27,50 | 28,50 | 28,80 | 30,00 | 30,30 | 30,60 | 30,90 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 27,60 | 28,60 | 28,90 | 30,10 | 30,40 | 30,70 | 31,00 | 9,25 | 9,75 | 10,25 | 10,75 | 11,25 | 11,75 |
| 10 000 001 и более | 27,70 | 28,70 | 29,00 | 30,20 | 30,50 | 30,80 | 31,10 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 | 12,00 |
| **Доллары США** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Евро** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,30 | 6,60 | 6,90 | 7,10 | 7,60 | 7,90 | 8,20 | 4,50 | 5,30 | 5,90 | 6,30 | 6,70 | 7,10 |
| 15 001 – 150 000 | 6,40 | 6,70 | 6,95 | 7,20 | 7,70 | 7,95 | 8,30 | 4,80 | 5,50 | 6,10 | 6,50 | 6,90 | 7,30 |
| 150 001 и более | 6,50 | 6,80 | 7,00 | 7,50 | 7,80 | 8,00 | 8,50 | 5,10 | 5,70 | 6,30 | 6,70 | 7,10 | 7,50 |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

ГЕНЕРАЛЬНЫЙ СПОНСОР НАЦИОНАЛЬНОГО ОЛИМПИЙСКОГО КОМИТЕТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ на период 01.08.2013-31.07.2017

www.belapb.by

белагропромбанк традиции будущего

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.



ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»

**с 25 июля 2014 года.**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки: до 6 месяцев 90-180 дней | от 6 месяцев до 1 года 181-370 дней | от 1 года до 2 лет 371 – 740 дней | от 2 до 5 лет 741 – 2000 дней |
|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | |
| 1–10 000 000 | **31,5** | **32,5** | **33,5** | **33,8** |
| 10 000 001–50 000 000 | **31,6** | **32,6** | **33,6** | **33,9** |
| 50 000 001 и более | **31,7** | **32,7** | **33,7** | **34,0** |
| **Доллары США, Евро** | | | | |
| 1 – 500 | **4,4** | **4,7** | **5,0** | **5,3** |
| 501 – 5 000 | **4,5** | **4,8** | **5,1** | **5,4** |
| 5 001 и более | **4,6** | **4,9** | **5,2** | **5,5** |
| **Российские рубли** | | | | |
| 1 – 15 000 | **8,40** | **8,80** | **9,10** | **9,30** |
| 15 001 – 150 000 | **8,50** | **8,90** | **9,15** | **9,40** |
| 150 001 и более | **8,60** | **9,00** | **9,20** | **9,50** |

Настоящие ставки применяются:

для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных с 01.08.2013 до 25.07.2014 – с 26.08.2014;

для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключаемых с 25.07.2014 – с 25.07.2014.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

белагропромбанк традиции будущего

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# ЭФІР І КОСМАС АЛЕГА ВІНЯРСКАГА

## АКЦЁР І ВЯДУЧЫ ЛІЧЫЦЬ, ШТО РАДЫЁ МУСІЦЬ СПРЫЯЦЬ ГАРМОНІІ І РАТАВАЦЬ ДУШЫ

**Ён пастаянна знаходзіцца ў пошуку новых магчымасцяў не толькі ў творчасці, але і ў самім сабе. Уласным прыкладам пацвярджае правіла — калі адны дзверы зачыняюцца, то трэба шукаць іншыя. Ужо не першы дзясятак гадоў гэты чалавек працуе на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Вядомы слухачам як дыктар, вядучы праграм «Вясёлы эфір», «Ліставанні», «Духоўнае слова», «Сустрэчы з песняй», а таксама пастаноўшчык многіх радыёспектакляў. Алег Вінярскі параўнаў радыё «тады» і «цяпер», расказаў пра акцэнты ў творчасці і неверагодныя ўласцівасці чалавечага голасу.**



### Разгадка нябачнага суразмоўцы

**— У чым для вас прывабнасць працы на радыё, якой аддадзена столькі гадоў?**

— Я на радыё прыйшоў у 1986 годзе, і цяпер здаецца, быццам шмат часу мінула, але для мяне ўсё прайшло амаль непрыкметна. Таму што кожны год я адкрываў нешта новае ў працэсе радыёмастацтва. Скажу шчыра, для мяне радыё стала разумелым толькі гадоў праз дзесяць. Раней яно здавалася апаратам, які, хочаш ты таго альбо не, станавіўся тваім нябачным суразмоўцам дома ці ў іншых месцах. Яго наяўную прысутнасць я разумеў толькі з цягам часу, калі прыйшоў на радыё працаваць.

Я не быў актыўным слухачом у той час, але спантанна знаходзіліся тыя перадачы, якія ўтрымлівалі мяне каля прыёмніка. Гэта мог быць голас, нейкая радыёпастаноўка, артыст ці проста цікавы дыялог, якія выклікалі жаданне стаць іх удзельнікам. І ўсё таму, што голас бывае больш важным за знешнасць. Як ні банальна прагучыць, але ён мае ўласцівасць па-асабліваму ўплываць на чалавека. Хочацца ўбачыць тых людзей, стаць саўдзельнікам прыгодніцкага і таямнічага працэсу.

**Прамы эфір я параўноўваю менавіта з выхадам на прасторы Сусвету, дзе ты становішся ўладаром яго, і трэба даказваць на справе, што ты варты такой ролі, маючы мікрафон і паўгадзіны часу.**

У савецкі час людзей адбіралі па конкурсе. І гэта была вельмі правільная сістэма, бо яна дазваляла ўбачыць магчымасці чалавека. Прафесія дыктара была адной з самых прэстыжных у той час. Дыктар лічыўся богам эфіру. Усе праграмы адбываліся з яго ўдзелам. Цяпер да іх змянілася стаўленне, а між тым дыктар — гэта школа прафесіяналізму. Сёння ж людзі часта прыходзяць да мікрафона без гэтай школы.

Быць на радыё стала модна. Аднак многія не разумеюць, што голас з'яўляецца зброяй, якая можа спрацаваць табе на карысць альбо супраць цябе. Калі ты не вызначыўся, на чыім баку ты змагаешся ў жыцці, то не зможаш расці. Таму што ўся інфармацыя, якая вырываецца ў навакольную прастору, некаму патрэбна і на нешта разлічана. І варта разумець, што зробленае табой на гэтай ніве інфармацыі мусіць працаваць на карысць. Каб спрыяць згодзе як у маштабах грамадства, так і асобнай сям'і.

### Выйсці за межы

**— Неяк вы казалі, што радыёспектаклі адкрылі для вас цэлы свет. Якія гэта былі адкрыцці?**

— Радыёмастацтва — унікальная з'ява. Хочацца, каб яно знайшло не толькі свайго слухача, але і крытыка, які будзе ацэньваць нашы крокі, аналізаваць іх… Чытаць у прамым эфіры — гэта вам не чытанне дома на канапе. Сядаеш перад мікрафонам, бачыш, як загараецца чырвоная лямпачка — і разумееш: перад табой космас адкрываецца. Прамы эфір я параўноўваю менавіта з выхадам на прасторы Сусвету, дзе ты становішся ўладаром яго, і трэба даказваць на справе, што ты варты такой ролі, маючы мікрафон і паўгадзіны часу. Многія беларусы і сёння чакаюць радыё ў сваёй хаце, як мілага госця, які заўсёды падорыць добрыя адчуванні і думкі… Для мяне прамы эфір у мастацкім слове — гэта экзамен на чалавечую і прафесійную годнасць.

Мяне насцярожвае, што маладое пакаленне тэатральных акцёраў не імкнецца прыйсці на радыё, авалодаць майстэрствам і знайсці тут увагу аўдыторыі. Ёсць безліч прыкладаў вялікіх творцаў, напрыклад, Інгмар Бергман, шведскі рэжысёр, які шмат зрабіў для радыё, ён пісаў і ставіў радыёп'есы. Альбо Федэрыка Феліні, у якога кар'ера рэжысёра кіно склалася пасля таго, як ён пачаў ставіць на радыё серыялы са сваім сябрам Танінам Гуэрам. Такія выдатныя пісьменнікі, як Бёль, Мрожэк, Борген, Бекет не лічылі працу для радыё другаснай, выдавалі зборнікі радыёп'ес і з радасцю ўдзельнічалі ў творчых спаборніцтвах, конкурсах, фестывалях…

**— Хто аказваў на вас уплыў у прафесіі?**

— Такіх людзей шмат было. Напрыклад, Ігар Васільевіч Лапцінскі — мой хросны бацька ў радыёрэжысуры. Памятаю, як у 1986 годзе ён даверыў мне, непадрыхтаванаму яшчэ да акцёрства на радыё, галоўную ролю ў радыёспектаклі «Мой генерал» паводле аповесці Альберта Ліханава. Не ведаю, што ім рухала, але я такому рашэнню здзіўляўся. Мне, хлопцу 24 гадоў, трэба было стаць 12-гадовым

**Уся інфармацыя, якая вырываецца ў навакольную прастору, некаму патрэбна і на нешта разлічана.**

дзіцём. Ён прымусіў размаўляць мяне на верхнім рэгістры, каб дабіцца фальцэтнага голасу, і спатрэбілася безліч дубляў, пакуль атрымалася тое, што задумаў рэжысёр. Гэты эпізод я звязваю потым са сваім прыходам у рэжысуру, бо і тады ён падтрымліваў мяне, даваў ацэнку і заўсёды казаў, што рэжысёру трэба мець балючую кропку і знаходзіць належныя сродкі, каб выказаць тыя рэчы, якія цябе хвалююць.

### Высоцкі, эмоцыі і важныя акцэнты

**— Праграма «Сустрэчы з песняй» чым адметная асабіста для вас?**

— Для мяне праграма «Сустрэчы з песняй» вельмі дарагая, таму што яна не толькі аднаўляе ў памяці старонкі з успамінамі людзей — яны вяртаюцца ў часы свайго дзяцінства, маладосці, закаханасці — а перш за ўсё з-за таго, што з намі дзеляцца набалелым у пісьмах. Калі так адбываецца — значыць, нам даверяюць, шукаюць у нас суразмоўцу. Я гэтым вельмі даражу. Перадаю думкі, пачуцці, трапятное стаўленне да мінулага, якое слухачы захавалі ў сваёй памяці і ў жыцці.

Людзі і сёння жывуць радыё. «Сустрэчы з песняй» — паказчык таго, што культура, музыка і слова жывуць і патрэбны людзям. Знаходзяць жа нашы героі час, каб напісаць пра свае ўспаміны, аднавіць нейкія сувязі для сябе… Пісьмы, якія прыходзяць да нас са словамі падзякі, — сведчанне недарэмнай працы. І я вельмі ўдзячны аўтару праграмы Таццяне Песнякевіч і гукарэжысёру Людміле Латушкінай, якія разам са мной спрабуюць знайсці месца ў душах слухачоў.

**— Якія ў вас ёсць уласныя ўспаміны, звязаныя з песняй?**

— Памятаю такі момант. Было гэта ў юнацтве. Аднойчы ў Кіеве стрыечны брат прапанаваў паставіць кружэлку з часопіса «Кругазор». Я пачуў песню «Кони привередливые» у выкананні Уладзіміра Высоцкага і не мог варухнуцца да яе заканчэння. У мае шматлікія музычныя захапленні (дзе пераважала заходняя музыка) уварваўся гэты голас-звон, які (як пазней зразумеў) быў сумленнем грамадства. Пачаў цікавіцца яго творчасцю, лёсам, адкрыўшы для сябе яго вялікі ўнутраны свет, уздзеянне якога не знікае з часам.

І ў нашай радыёпраграме мы стараемся як мага шырэй аказаць музычную палітру ў разнастайнасці імёнаў, жанраў.

**— Ці складана прапускаць праз сябе чалавечыя эмоцыі?**

— Пасля эфіру я не адчуваю стомленасці эмацыянальнай, а з'яўляецца свайго роду пад'ём, бо ў гэтых споведзях-успамінах я знаходжу для сябе натхненне.

**— А не ўзнікае шкадавання, што аднойчы выбралі менавіта такую дарогу?**

— У свой час я не вярнуўся ў тэатр Якуба Коласа, таму што хацелася рэалізоўваць сябе ў сталіцы. Прайшоўшы безліч проб і праглядаў, вырашыў знайсці працу. Дыктарскі пачатак сам прыцягнуў мяне… Не магу сказаць, быццам аддаліўся ад тэатральнай культуры і стаў зусім іншай справай займацца. Радыётэатр існуе ў маім жыцці паралельна з іншымі планамі і думкамі па іх рэалізацыі. Хочацца нешта паставіць і на тэатральнай сцэне. Цяпер я не толькі сяджу перад мікрафонам, але і паказваюся… Напрыклад, рэжысёр Наталля Родзіна, якая ўзначальвае тэатральную студыю «Дасканаласць», запрасіла мяне на ролю Лазара Богшы, аднавіўшы пастаноўку спектакля «Крыж» Аляксея Дударава. Мы ўжо некалькі разоў паказвалі яго на розных пляцоўках і атрымлівалі станоўчыя водгукі. Плюс мая дзейнасць ва ўласным тэатральным праекце «Кніжыца», дзе мы разам з калегамі працуем над спектаклем «М. Гогаль — С. Ясенін. Паміж двух партрэтаў». Плануем паказы на восень.

Мне хацелася б яшчэ многае зрабіць, у тым ліку і на тэатральнай сцэне. Безумоўна, калі знайду для гэтага час без адрыву ад сённяшняй працы. Творчая дзейнасць не спыняецца. Мне цікава адкрываць нешта новае ў сабе. Яшчэ студэнтам здымаўся ў выдатнага рэжысёра Віталя Дудзіна, а потым мая праца ў кіно спынілася. Былі нейкія запрашэнні на здымкі серыялаў, але я не разглядаю сябе ў якасці кінагероя і не бачу перспектыў на гэтым полі. Мяне больш цікавіць літаратура ў яе дачыненні да сцэнарна-рэжысёрскай дзейнасці.

Ёсць яшчэ фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм Magnificat» дзе я не толькі ўваходжу ў склад журы, але і агучваю замежныя фільмы. Гэтая дзейнасць таксама вельмі важная для мяне. Я лічу, яна павінна працягвацца незалежна нават ад колькасці прынятых на конкурс фільмаў, таму што так творцы маюць магчымасць уздзейнічаць на душы людзей. Так магчыма накіраваць чалавека шляхам любові, гармоніі, людской згоды, якія, мабыць, у нейкай ступені страчваюцца ў залежнасці ад часу. Важна падтрымаць імкненне творцаў вярнуць веру ў суразмоўцу, запомніць дэфіцыт чалавечага няўмення размаўляць. Мастацтва павінна вярнуць усіх нас да культуры правядзення вольнага часу, дзе галоўнае не забава, а імкненне спазнаць існасць з'яў, адысці ад мітусні і прыйсці да пазнання вечнага, дабіўшыся гармоніі ў душы. Думаеце, мара? Але толькі яна рухае сапраўднае мастацтва.

**Алена ДРАПКО.**

■ Векапомнае

# Тое, што з намі было

## Першую сусветную тыя, хто яе перажыў, называлі «Вялікай еўрапейскай вайной»

**28 ліпеня на тэлеканале «Беларусь-1» стартуе цыкл хранікальна-дакументальных фільмаў «Вялікая вайна», прымеркаваны да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай. Аўтары праекта паспрабавалі паказаць падзеі таго часу «вачамі відавочцаў» і «не згубіць чалавека».**

— Нашы веды пра тую вайну часцей за ўсё зводзяцца да некалькіх дат, а што было паміж імі, мала хто ведае. Але для Беларусі тая вайна — адна з найважнейшых вех у гісторыі. Таму мяне як гісторыка цікавіла, што ж там насамрэч адбывалася, — дзеліцца **аўтар і кіраўнік праекта, аўтар сцэнарыя Ксенія ЛУЦКІНА.** — Самым складаным падчас працы было «ўкласці» падзеі аднаго года ў 39 хвілін. Вельмі цяжка было эмацыянальна, таму што, напрыклад, ваенных пахаванняў таго часу на Беларусі вельмі шмат. Нам вядома каля трохсот. І вось уявіце, мы сваімі нагамі прайшлі фактычна за год іх усе.

Вайна 1914–1918 гадоў — першы канфлікт, у які было ўцягнута насельніцтва практычна ўсяго свету. 38 дзяржаў, 4 тысячы кіламетраў фронту, 7 350 000 чалавек, мабілізаваных у армію, 20 мільёнаў параненых і амаль 10 мільёнаў забітых, а яшчэ больш за 5 мільёнаў загінулых ад голаду і эпідэмій сярод мірнага насельніцтва. Лічбы самі па сабе жудасныя, а за імі стаяць гісторыі забытых герояў, іх лёсы і боль. Сама назва «Першая сусветная» з'явілася ў гістарыяграфіі толькі ў 1939 годзе, пасля пачатку Другой сусветнай. У ваенны і пасляваенны перыяд яе называлі «Вялікай вайной», «Вялікай Айчыннай», «Вялікай еўрапейскай вайной» — гэтыя назвы паказваюць стаўленне насельніцтва да падзей таго часу…

— Мне здаецца, што гэта была апошняя высакародная вайна. Калі з палоннымі абыходзіліся больш-менш па-чалавечы, і працаўнікі практычна па-рыцарску ставіліся адзін да аднаго, — падзяліўся ўражаннямі пасля прагляду **намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь-1» Сяргей ШЫШКО.** — І гэта не галаслоўныя сцвярджэнні. Мой дзед быў у палоне падчас Першай сусветнай. Я неяк убачыў фотаздымак, на якім ён стаіць у афіцэрскай форме з нейкай нашыўкай на грудзях, і пачаў распытваць, дзе ён знаходзіўся тады. Дзед расказаў, што быў у палоне, а месца на фота — бібліятэка. З той вайны ён прывёз падручнік першага расійскага імператарскага тэатральнага мастацтва, які ўзяў на памяць, калі іх вызвалілі. І гэтая кніга захоўваецца ў нас дома. Таму мая сям'я мае непасрэднае дачыненне да гістарычных падзей таго часу.

Аўтары праекта зазначаюць, што гісторый, падобных да вышэйпрыведзеных, было шмат. У нас амаль у кожнай сям'і там ваявалі дзед альбо прадзед. Якую ж памяць пакінула тая вайна ў людзей, як жыло мірнае насельніцтва ва ўмовах баявых дзеянняў і нямецкай акупацыі — гледачы змогуць даведацца ўжо зусім хутка.

Цыкл «Вялікая вайна» складаецца з чатырох серый, кожная з якіх адкрывае невядомыя старонкі гісторыі Першай сусветнай. Першы фільм «Ачышчальная навальніца» распавядае пра пачатак вайны з 28 ліпеня 1914 да 13 жніўня 1915 года: якія захады прымалі для забеспячэння парадку ў той час, пра шпіёнаманію, мабілізацыю, першыя баявыя дзеянні і іх удзельнікаў-беларусаў. Другі фільм «Вялікі выхад» пакажа перыяд з 14 жніўня 1915 года да пачатку 1916-га. Гледачы ўбачаць жыццё пад акупацыяй, даведаюцца пра тактыку «выпаленай зямлі» і пра тое, як пачыналася працяглая акопная вайна. Фільм «Вайна акопаў» пакажа супрацьстаянне працаўнікаў, калі нават сапёрная рыдлёўка стала зброяй. Стваральнікі праекта правядуць нас па месцах ваенных змаганняў і пакажуць сляды «акопнай вайны». У чацвёртым фільме «Крах імперый» аўтары задаюцца пытаннем: ці пачыналі б манархі тую вайну, калі б загадзя ведалі, які лёс іх чакае пасля яе завяршэння? Ці былі ў ёй пераможцы і пераможаныя?..

У фільме часткова прысутнічае рэканструкцыя. З ёй дапамагалі ўдзельнікі ваенна-патрыятычнага клуба «Грэнадзёр». Вось што расказвае яго кіраўнік **Аляксандр БУРАНКО** пра ўдзел у аднаўленні ваенных падзей:

**20.00** Камедыя «Самка».
**21.30** Камедыя «Апельсінавы сок».
**23.15** Дэтэктыў «Пярэварацень у пагонах».
**0.50** Драма «Якія сышлі з нябёсаў».
**2.20** Меладрама «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».
**4.00** Трагікамедыя «Вяселле».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00, 12.00, 19.00** Зрабі або пампы.
**7.00** Займальная навука.
**8.00, 13.00** Дзікі тунец.
**9.00, 14.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**10.00** Суперзбудаванні.
**11.00** Скарбашукальнікі.
**15.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**17.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**18.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**20.00, 0.00, 3.00** Эвакуацыя Зямлі.
**21.00, 1.00, 4.00** У чаканні канца свету.
**22.00** Навуковыя недарэчнасці.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

## DISCOVERY

**7.00** Чыгунка Аляскі.
**7.50** Круты цюнінг-2013.
**8.40, 13.15, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 13.40, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Майстры выжывання.
**10.30, 5.10** Не спрабуйце паўтарыць.
**11.25, 16.25** Ліквідатар.
**12.20, 0.55** Top Gear.
**14.10, 3.55** Што ў вас у гаражы?
**15.05, 6.05** Махінатары.
**19.10** Смяротны ўлоў.
**21.00** Горад навыварат.
**22.00** Выратавальны яд.
**23.00** Цуды Сонечнай сістэмы.
**0.00, 3.05** Каралі аўкцыёнаў.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# СУБОТА, 2 ЖНІЎНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**7.20** Існасць.
**7.45 Меладрама «Малахольная».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.45, 23.25 Серыял «Сваты 5».**
**10.55** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** Давярай і правярай.
**12.50** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**13.30** Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Яны спявалі за Радзіму». Фільм 3-і.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30, 0.35** «Вялікая розніца».
**17.15 Меладрама «Гувернантка».**
**19.10, 21.40 Меладрама «Мой любімы геній».**
**21.00** Панарама.
**0.25** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.10 Фільм — дзецям «Прыгоды Тома Соера».**
**8.35** М/с «Клуб Винкс. Школа чараўніц».
**8.50** Беларуская кухня.
**10.25, 21.05** Тэлебарометр.
**10.30, 21.40 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**12.30** «Два з паловай кухары».
**13.00 Маст. фільм «Зямля Саннікава».**
**14.50** Вышэй за дах.
**15.25 Камедыя «Вялікі Бак Ховард».**
**17.10 Камедыя «Паляўнічыя на прывідаў».**
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** Пад грыфам «Вядомыя».
**21.00** КЕНО.
**21.10** Рэальны свет.
**23.35 Фантастыка «Невідзімка».**
**1.40** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Ліверпуль» — «Мілан».

## АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «ТБ-таксі».
**12.30** «Народная медыцына».
**13.25 Драма «Інтэрдзяўчынка».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Луі дэ Фюнес. Чалавек-аркестр».
**17.20 Камедыя «Рэстаран спадара Сепціна».**
**19.00** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**21.05** «Паўтары!».
**23.20** Фестываль жывой музыкі «МОСТ».
**0.30 Маст. фільм «Звар'яцелае сэрца».**

## СТБ

**6.15 «Турысты». Серыял.**
**7.45** «Анфас».
**8.00 Камедыя «Шоу пачынаецца».**
**9.45** «Чыстая праца».
**10.40** «Уявіце сабе».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.35 Баявік «У зоне асаблівай увагі».**
**15.20** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Такі лёс».
**18.35** «Разумней не прыдумаеш».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Золата дурняў».**
**22.10** «Зорны рынг». «Замежныя хіты».
**23.10 Драма «Рока і яго браты».**
**2.05** «Глядзець усім!».

## МІР

**5.00** М/ф.
**6.10 Маст. фільм «Гараджане».**
**7.35** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**7.50** «Ой, мамачкі».
**8.15** «Эксперыментатары».
**8.30** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**9.00, 15.00** Навіны (бягучы радок).
**9.10** «Любімыя акцёры».
**9.40 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».**
**11.05 Серыял «Няма выратавання ад кахання».**
**15.10 Серыял «Чырвоная капэла».**
**21.25 Маст. фільм «На краі стаю».**
**22.55 Трылер «Ружы для Эльзы».**
**0.45 Маст. фільм «Хагі-Тралер».**
**2.20** Дак. фільм «Дзённік назіранняў Сяргея Маёрава».
**3.20 Камедыя «Свінарка і пастух».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Камедыя «Недатыка».**
**10.10** «Сам сабе рэжысёр».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Смехапанарама».
**11.45** «У свеце жывёл».
**12.20** М/ф.
**13.00** «Сусветны рынак».
**14.15** «Масфільм». 90 крокаў».
**14.30** «Пакой смеху».
**15.00 Маст. фільм «Перад экзаменам».**
**16.20 Меладрама «Восеньскі ліст».**
**18.10 Меладрама «Маміна каханне».**
**21.00** «Нядзельны вечар».
**22.40 Дэтэктыў «Прыватны дэтэктыў Таццяна Іванова. Дарагая мая служанка».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Порах і шрот».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.25 Серыял «Порах і шрот».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны +».
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20 Маст. фільм «Аферыстка».**
**15.05 «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.**
**16.20** «Следства вялі...».
**17.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**20.00** «Самыя гучныя рускія сенсацыі».
**21.45** «Ты не паверыш!».
**22.35 Серыял «Грамадзянка начальніца. Працяг».**
**0.15** «Як на духу».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 11.55, 19.00, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**9.25 Серыял «Страла».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**
**12.00 Камедыя «Два стваллы».**
**13.50 Драма «Харысты».**
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Фантастыка «Чужы супраць драпежніка».**
**18.15 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**19.05 Трылер «Пустэльнік».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Маці і дзіця».**
**23.20** «Кінаблакнот».

## ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00** «Міксер».
**12.00** «Спытайце кухара».
**13.00 Серыял «Аманда О».**
**15.00 Камедыя «Вясельная вечарынка».**
**17.00, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.30 Камедыя «Вялікі Стэн».**
**22.45** Скетч-шоу «6 кадраў».
**23.30** «Нерэальная гісторыя».
**0.30** «Лаві момант».

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** «Звычайны канцэрт».
**9.35 «Украіна». Маст. фільм.**
**11.05** Вялікая сям'я. Павел Чухрай.
**12.05** Пернікавы домік. «Драўляныя карункі».
**12.30, 0.55** «Жывая прырода Францыі». Дак. серыял.
**13.25** «Красуйся, горад Пятроў!».
**13.55** Фальклорны фестываль «Уся Расія».
**15.10** «Жыхары даліны Вагі». Дак. фільм.
**16.05** «Больш, чым каханне». Уладзімір Васільеў і Кацярына Максімава.
**16.50** «Рамантыка рамансаў». Саліст Марыінскага тэатра Васіль Герэла.
**17.40** «Астравы». Яўген Еўсцігнееў.
**18.20 «Дзямідавы». Маст. фільм.**
**20.50** Па слядах тайны. «Ці была ядзерная вайна да нашай эры? Індыйскі след».
**21.35** «Белая студыя». Сяргей Бязрукаў.
**22.15 Кіно на ўсе часы. «Сарабанда». Маст. фільм.**
**0.05** «Луі дэ Фюнес назаўжды». Дак. фільм.
**1.50** «Абулькасім Фірдаусі». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** Дак. фільм «Два партрэты на гукавой дарожцы».
**6.10** Фільм-канцэрт «Гэта было, было... Уцёсаў, Адэса і мора». 1989 год.
**6.30, 0.40 Маст. фільм «Кватэра».**
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.15** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Прыватызацыя». 1992 год.
**11.00** Творчы вечар Гелены Велікананавай у Тэатры Эстрады. 1991 год.
**12.30 Тэлефільм «Следства вядуць Знаткі».**
**15.00** «Колба часу». «Самыя папулярныя чуткі ў СССР».
**16.00** «Кінапанарама». 1963 год.
**16.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**17.00** «Вячэрняе музычнае кафэ запрашае». 1992 год.
**18.25** «Што? Дзе? Калі?». 1-я міжнародная гульня. 1-я частка. 1988 год.
**19.30** «У коле сяброў. Уладзімір Вінакур». 1986 год.
**20.50 Маст. фільм «Неверагодны заклад, або Сапраўднае здарэнне, якое шчаслі ва завяршылася сто гадоў таму».**
**22.10** Тэлешоу «50/50». 1990 год.
**23.00** Дак. фільм «Устань, зборная!».
**23.35** Мульт-хіт-парад «Раніча каю». 1990 год.
**1.40** Фільм-канцэрт «Гэта было, было...». Танцавальныя рытмы 1960-х гадоў.
**4.00** «Да і пасля паўночы». 2-я частка. 1988 год.

## EUROSPORT

**9.30, 11.30, 13.30, 18.30** WATTS.
**15.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Валоніі.
**16.30, 1.00** Веласпорт. Веланогка ў Сан-Себасцьяне.
**19.00** Конны спорт.
**20.30, 2.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**22.00** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.

## КАМЕДЫЯ

**5.00, 13.25, 2.05** Камедыя «Жанчына».
**5.25, 13.50, 2.30** Камедыя «Кантралёр універмага».
**5.55** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**7.45** Дэтэктыў «Сутэнёр».
**9.15, 16.25, 21.00** Камедыя «Вандроўнік».
**9.40, 16.50, 21.30** Камедыя «Імігрант».
**10.05** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**11.45** Камедыя «Джэнтльмены аддаюць перавагу блондзінкам».
**14.20** Меладрама «Двое — гэта занадта».
**17.20** Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
**18.40** Камедыя «Яго новая праца».
**19.20** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**20.45, 21.50, 1.50, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**22.10** Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».
**0.15** Камедыя «Мой хлопец — Анёл».
**3.00** Меладрама «Больш, чым сябар».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00, 5.35** «Залатая цешча». Серыял.
**11.00** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**11.45** «Гісторыі выратавання».
**12.15, 1.20** «Тайны нашага кіно. «Карнавал».
**12.45, 1.50** «Карнавал». Маст. фільм.
**15.20, 23.15** «Космас, які пакарылі». Дак. фільм.
**16.45** «Гобі». М/ф.
**18.10, 4.15** «Як прыручыць голад». Дак. фільм.
**19.40** «Першы пасля Бога». Маст. фільм.
**21.30** «Прадчуванне». Маст. фільм.
**0.35** «Белы каўнерык». Серыял.

## ТБ1000

**5.00** Драма «Праз Сусвет».
**7.40, 1.10** Фільм жахаў «Страшыдлы».
**9.50, 15.20** М/ф «Дом-монстр».
**11.40** Камедыя «Алекс і Эма».
**13.30** Камедыя «Міс Петыгру».
**17.05** Камедыя «Гатэль рамантычных спатканняў».
**19.00** Драма «Глыбокае сіняе мора».
**20.50** Трылер «Тормаз».
**22.30** Фантастыка «Вяртанне Супермена».
**3.10** Трылер «Праўда пра Чарлі».

## РУССКОЕ КИНО ТВ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Трагікамедыя «Душка».
**8.05** Трагікамедыя «Вяселле».
**10.00** Камедыя «Самка».
**11.30** Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».
**12.50** Меладрама «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
**14.20** Меладрама «Паралельныя светы».
**16.00** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**18.00** «Ты ў мяне адна».
**20.00** Баявік «Брыгада: Наследнік».
**21.50** Трылер «Самнамбула».
**23.20** Драма «Слон».
**1.00** Меладрама «Са мною вось што адбываецца».
**2.25** Драма «Год сабакі».
**4.50** Камедыя «Свята Нептуна».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Цяжкае золата Аляскі.
**7.00** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Займальная навука.
**9.00** Космас: Прастора і час.
**10.00** Рэальнае паранармальнае.
**11.00** У пошуках Атлантыды.
**12.00** Вялікія ўцёкі.
**13.00** Нямецкая армія Чэрчыля.
**14.00** Невядомае падарожжа Дарвіна.
**15.00** Астравы.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.00, 2.00** Дзікі тунец.
**18.00** Зрабі або пампы.
**19.00, 2.00** Голая навука.
**20.00, 0.00, 3.00** Космас: прамы эфір.
**21.00, 1.00, 4.00** Жыццё ў космасе.
**22.00** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**7.00** Як гэта ўстроена?
**7.25, 14.35** Што ў вас у гаражы?
**8.15** Голыя і напалоханыя.
**9.10, 2.40** Рачныя монстры.
**10.05** Смяротны ўлоў.
**11.00, 6.05** Ліквідатар.
**11.50, 16.25, 18.15, 20.35** Паляўнічыя на склады.
**12.45, 5.10** Майстры патагавацца.
**13.40** Мотабітва.
**15.30** Аўтападполле.
**21.00** Самагоншчыкі.
**22.00** Вершнікі пекла.
**23.00** Мафія амішаў.
**0.00** Выратавальны яд.
**0.55** Горад навыварат.
**1.50** Цуды Сонечнай сістэмы.
**3.30** Дзённікі вялікай вайны.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**4.45** Як гэта зроблена?

# НЯДЗЕЛЯ, 3 ЖНІЎНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**7.25 Камедыя «Цырк».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40, 0.10 Серыял «Сваты 5».**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.10** Каробка перадач.
**13.45** Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Яны спявалі за Радзіму». Фільм 4-ы.
**14.25** Дыялогі аб цывілізацыі.
**15.15** Твой горад.
**15.30** «Зорнае жыццё». «Слёзы клоўна».
**16.40 Меладрама «У люстэрка два тварыы».**
**19.05 Меладрама «Малахольная».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15 Меладрама «Копія верная».**

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.20 Фільм-казка «Галёшы шчасця».**
**8.55** М/с «Клуб Винкс. Школа чараўніц».
**10.05** Мазгавы штурм.
**10.35, 20.25** Тэлебарометр.
**10.40, 21.40 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**12.40** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**13.15 Баявік «Дрэнныя хлопцы».**
**15.25** Пад грыфам «Вядомыя».
**16.00 Фантастыка «Невідзімка».**
**18.05** «Comedy Батл. Без межаў».
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Кіпень».
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Рэальны свет.
**23.40 Камедыя «Вялікі Бак Ховард».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.20, 21.05, 1.00** «Калейдаскоп».
**8.10** «Таямніца душы».
**8.40** «Размаўляем па-беларуску».
**8.45 Серыял «Мегрэ».**
**13.30** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**14.20 «Старажытнае паданне. Калі сонца было богам». Маст. фільм.**
**16.40** «Залаты Віцязь. Мікалай Бурляеў». Дак. фільм.
**17.40** «Аўтограф». Валянцін Краўцоў — кіраўнік Гомельскага сімфанічнага аркестра.
**18.10, 22.40** «Культпрасвет».
**18.35 Сусветнае кіно. «Легенды восені».**
**20.45** Калыханка.
**21.15** «Ад сэрца да сэрца...». Рамансы ў выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Тамары Пячынскай.
**23.10** А.М. Астроўскі. «Банкрут». Спектакль Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.55, 16.55** Тэніс. Турнір ВТА. Стэнфард. Паўфіналы.
**12.00** Більярд. Чэмпіянат Еўропы.
**14.05** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Ліверпуль» — «Мілан».
**16.00** «Рыа-2014».
**18.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ.
**20.50** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Рэал».
**22.50** Аўтаспорт. Velcom — Чэмпіянат Беларусі па дрыфтынгу.
**0.00** Тэніс. Турнір ВТА. Стэнфард. Фінал.

## АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропавядзь (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.10** «ТБ-таксі».
**11.35** «Ідэальны рамонт».
**12.30** «Ералаш».
**12.55 Маст. фільм «Да мяне, Мухтар!».**
**14.20 Камедыя «Не можа быць!».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Па слядах вялікіх рускіх падарожнікаў».
**17.20** «Асяроддзе пражывання».
**18.20** «Хвіліна славы».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Клуб

# РАДЗІМА — І КРЫЛЫ, І КРЫНІЦА ДЛЯ НАТХНЕННЯ

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Ігар Петрышэнка ўручыў у Маскве медаль Францыска Скарыны вядомаму расійскаму і беларускаму пісьменніку Валерыю КАЗАКОВУ.**

У апошнія гады толькі ў Мінску пабачылі свет шэсць кніг таленавітага паэта, празаіка, публіцыста. А літаратурны шлях Валерыя Казакова пачынаўся з падтрымкі, добрых слоў такіх пісьменніцкіх славутасцяў Расіі, як Андрэй Вазнясенскі, Юна Морыц... Сярод мінскіх выданняў нашага земляка — «Выбранае» ў серыі «Беларускі кнігазбор». Адна з кніг — «Прагнутыя нябёсы» аддрукавана як па сённяшнім часе надзвычай вялікім накладам — 7000 экзэмпляраў. Валерый Мікалаевіч — член Саюза пісьменнікаў Беларусі. За ўклад у інтэграцыйныя працэсы пісьменніцкіх супольнасцяў адзначаны медалём СПБ «За вялікі ўклад у літаратуру».

Уручаючы дзяржаўную ўзнагароду нашаму суайчыннику (Валерый Мікалаевіч нарадзіўся на Магілёўшчыне), Ігар Петрышэнка падкрэсліў шматгранную работу пісьменніка ў грамадзе беларускай дыяспары ў Расіі, звярнуў увагу на многія ініцыятывы нашага земляка ў грамадска-палітычных, культурна-асветніцкіх стасунках народаў Расіі і Беларусі. Выставы ў музеях, падтрымка кнігавыдавецкай дзейнасці, перадача мастацкіх каштоўнасцяў, якія маюць дачыненне да Беларусі, з розных мастацкіх скарбніц Расіі — гэта далёка не поўны пералік добрых спраў старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Валерыя Казакова.

Пра адчуванні ў сувязі з высокай адзнакай, самім фактам уручэння ўзнагароды карэспандэнт запытаўся ў самога Валерыя Мікалаевіча:

— Якія могуць быць адчуванні, акрамя радаснай удзячнасці?.. А пра што думаецца ў звязку з гэтым... Ды, відаць, і пра тое, што Радзіма для кожнага з нас, як творчага чалавека, так і звычайнага, — і крылы, і крыніца натхнення. Да роднай старонкі заўсёды цягне, таму і дом у мяне ёсць у Беларусі, таму і цікавіць мяне справы ў роднай Айчыне, за якую перажываю, за якую думкамі і словамі малюся.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

■ Госці да нас

# ПРЫВІТАННЕ АД ЗЕМЛЯКОЎ МАХТУМКУЛІ

## Беларусь і Туркменістан сябруюць культурамі

**Дні культуры Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь адкрыліся ў Белдзяржфілармоніі канцэртнай праграмай. Але ёй папярэднічала выкананне гімнаў дзвюх краін. Што цікава: туркмены, якія былі ў зале, слухалі іх, паклаўшы руку на сэрца. Вось жа павага да традыцый, да гаспадароў, падумалася ў той момант. А потым — цягам канцэрта — думка пра традыцыі і павагу да іх толькі ўмацавалася — з пераносам у наш, беларускі бок, з думкамі пра сваю, беларускую культуру: іншыя нас цікавяць яшчэ і тым, што даюць магчымасць зразумець, што такога адметнага (і каштоўнага) ёсць у нас.**

Дэлегацыя Туркменістана прадумала, якую праграму весці ў Беларусь: цудоўнае выкананне Шапэна на фартэпіяна прадэманстравала высокі ўзровень сучаснай прафесійнай культуры гэтай краіны. Эстрадныя песні дыскатэчнага гучання паказалі, што развіваецца напрамак моладзевай музыкі, прычым туркменскія артысты ў модных строях (хлопцы і дзяўчаты) спявалі песні ў сучасных рытмах на роднай мове. Але ўсё ж, калі ёсць магчымасць пазнаёміцца з культурай іншых народаў, то больш за ўсё кранае тое, чаго няма ў нас. Нездарма ж традыцыйная песня «Напаі мяне» з вялікім размоўным пралогам па-туркменску выклікала ў зале сярод беларусаў ці не найбольшыя авацыі. У іншай культуры цікавае тое, што ёсць толькі ў ёй і больш нідзе. Нездарма на адкрыцці Дзён культуры Туркменістана ў Беларусі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Туркменістана ў Беларусі Мурад ЯЗБЯРДЗІЕЎ** падкрэсліў:

— Базай любых цывілізаваных чалавечых адносін з'яўляецца культура. Таму кіраўнікі нашых дзяржаў падкрэсліваюць важнасць культурных кантактаў. У выніку правядзенне такіх мерапрыемстваў стала традыцыйным і ўзаемным... У цяперашнім глабалізаваным свеце знаёмства з культурнымі традыцыямі адно аднаго спрыяе яшчэ большаму збліжэнню нашых краін і іх культурнаму ўзбагачэнню. У Туркменістане развіццё культуры і мастацтваў з'яўляецца адным з дзяржаўных прыярытэтаў, які ўплывае на дасягненні ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Вядома, што культура ўплывае на адукацыю і эстэтычнае выхаванне людзей, то бок на чалавечы фактар. Таму прыемна адзначыць, што ў сістэме адукацыі Беларусі цяпер навучаецца больш за 9000 грамадзян Туркменістана. Патэнцыял культурнага ўзаемадзеяння нашых народаў вялізны. І ў гэтыя дні адбудуцца цікавыя сустрэчы, што стане глебай для развіцця кантактаў і новых культурных праектаў.

Насамрэч культурныя стасункі з Туркменістанам у нас сапраўды плённыя — і не скажаш, што вялікая адлегласць паміж нашымі краінамі. У нас, у Беларусі, выходзяць кнігі, напрыклад, зборнік твораў сучасных пісьменнікаў Беларусі і Туркменістана «Сугучча сэрцаў», выходзяць творы класіка туркменскай літаратуры, паэта (а для яго народа — нават прарока) Махтумкулі ў перакладзе на беларускую мову нашых творцаў. Ёсць шмат іншых праектаў, якія ажыццяўляюцца на дзяржаўным узроўні. Напрыклад, Дні культуры Туркменістана ў Беларусі адбыліся ў 2010 годзе, у 2012-м быў візіт у адказ беларускай дэлегацыі з Днямі культуры. Былі Дні беларускага кіно ў Туркменістане. І зноў — госці да нас. І што тут гадаць наконт сакрэту нашай асаблівай блізкасці, нягледзячы на геаграфічную адлегласць?..

**Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ** адзначыў:

— Дні культуры падмацоўваюць стасункі паміж краінамі і іх кіраўнікамі. Мы выконваем асаблівую місію па ўмацаванні дружбы паміж народамі Беларусі і Туркменістана. Беларускі і туркменскі народы валодаюць унікальным гістарычным вопытам і багатымі культурнымі традыцыямі, частка з якіх сфарміравана іх сумеснымі намаганнямі. Знаёмства з нацыянальнай спадчынай адно аднаго здольнае яшчэ больш узбагаціць нашы краіны. Адметна, што цяперашняе мерапрыемства праводзіцца ў год 70-годдзя вызвалення Беларусі. Нас звязвае агульная памяць: у мемарыяльнай зале Перамогі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны РБ ушанаваныя імёны туркменаў, якія атрымалі званні Герояў Савецкага саюза за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях на беларускай зямлі.

Фота БЕЛТА.

Гісторыя — цікавая з'ява. Мы гаворым пра адзіную, але пры гэтым маем на ўвазе, што кожны народ праходзіў усё ж свой вялікі шлях, няпросты, але адметны менавіта з-за тых умоў, у якіх існаваў. Пра адметнасць туркменскай культуры ў яе гістарычным развіцці можна паразважаць, наведаўшы выставу з фондаў Марыйскага велаяцкага гісторыка-краязнаўчага музея, якая размясцілася ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Неасабісты суб'ектыў

# ТРАВА ПРЫ ДАРОЗЕ

## Нават некалькіх імгненняў, калі дзіця сам-насам з навакольным светам, дастаткова, каб здарылася непапраўнае

На нашых мясцовых могілках, акурат «у галавах» маіх бацькі і бабулі, ляжыць хлопчык Саша. Пад маленькім крыжыкам з фота, на якім пазірае ўсмешлівы гарэзлівы тварык. Кожны раз, наведваючы родных, я ў нейкі момант пачынаю ўглядацца ў яго, спрабуючы ўявіць, якім бы гэты навечна чатырохгадовы хлапчук стаў цяпер, кім бы працаваў, ці былі б у яго дзеці: ён усяго на чатыры гады маладзейшы за мяне. Пэўна, быў бы ўжо мажным мужчынам, апорай сваёй ужо цяпер зусім нямоглай маці, дапамогай і сябрам братам і сястры...

Я памятаю, як Саша загінуў. Гэта было ў першыя дні летніх канікул, калі ўся вясковая дзятва гуляла на вуліцы. Конь, запрэжаны ў воз, які нёсся шалёным намётам па нашай цяхай спакойнай вуліцы, не разбіраючы дарогі, выскачыў нечакана, нібы з пекла. (Аказалася, на яго напалі ці то авадні, ці то пчолы, і жывёліна проста звар'яцела, абарвала прывязь і панеслася наўздагад, шукаючы паратунку). Вясковыя дзеці, прывучаныя з маленства, што конь — гэта не толькі дапамога, але і небяспека, мы кінуліся ўроссып на ўзбочыны вуліцы. Саша аказаўся на іншым баку, чым сястра з братам, і вырашыў да іх перабегчы. Не паспеў — трапіў якраз пад капыты ашалелай жывёлы. Цяжкі капыт з лёгкасцю праламаў чатырохгадоваму дзіцяці галаву.

Па Сашу галасіла ўся вёска, бацькі над маленькай дамавінай пачарнелі ад гора. Іх не было побач з дзецьмі ў той трагічны момант, як не было і ўвогуле нікога са старэйшых, хто мог бы спыніць таго каня. Усе былі на працы, дзеці былі самі па сабе: ні дзіцячага сада, ні дзіцячага лагера ў школе (да якой да таго ж тры кіламетры) тады не было. На месцы хлопчыка Сашы мог быць любы з нашай стракатай дзіцячай кампаніі. Летам мы раслі фактычна як трава пры дарозе: кінутыя ў лепшым выпадку на глухаватых і падслепаватых бабуль-прабабуль, ад якіх з лёгкасцю збягалі ў пошуках прыгод, ці на ненашмат старэйшых сясцёр-братоў, якія і самі супроць прыгод нічога не мелі. Успамінаючы сёння гэтыя самыя прыгоды, разумееш, што анёлахоўнік быў тады пільнай нянькай, і толькі дзякуючы яму мы перажылі тое сваё небяспечнае дзяцінства...

Мінула больш за трыццаць гадоў, шмат што змянілася, над маленькімі грамадзянамі краіны гэта самая краіна, без перабольшвання, калоціцца: каб усё было бяспечна, каб кожны быў заняты і дагледжаны, каб бацькі маглі спакойна займацца сваёй справай, не хвалюючыся, ці не ўлезла дзіця ў якую шкоду. Летнікі, групы падоўжанага дня, гурткі, клубы па інтарэсах — нават у вясковых невялікіх школах гэтыя пацыі не выглядаюць фантастычнымі. Працуе (і эфектыўна працуе!) цэлая сістэма...

... Але чаму тады на кладах штогод з'яўляюцца свежыя невялікія магілкі з усмешлівымі дзіцячымі тварыкамі на помніках? За апошнія пяць дзён іх у нашай невялікай краіне — як мінімум пяць. Як засведчыла б абыякавая статыстыка — у сярэднім па адным смяротным выпадку за дзень. Маю на ўвазе, калі здарылася не непазбежнае, а недарэчна-выпадковае. У Пінскім раёне шасцігадовы хлопчык перабягаў вуліцу перад грузавіком. Вадзіцель, убачыўшы дзіця, ударыў па тармазах, але гружаная цяжкая машына кацілася яшчэ некалькі метраў і пераехала кволую фігурку. Перад гэтым у Пінску дзесяцігадовая дзяўчынка патанула, ратуючы сяброўку. Купаліся яны ў небяспечным і не прыдатным да купання месцы, дабрацца да якога ўвогуле можна толькі на лодцы або аб'ехаўшы 20 кіламетраў. Дзяўчынку да месца яе гібелі прывёз ў чоўне... уласны дзядуля. У Маларыцкім раёне дванадцацігадовы хлопчык прыехаў з бацькамі купацца (зноў жа ў месцы, дзе рабіць гэта забаронена) і выратаваць яго не ўдалося. У Рагачове ў Дняпры (а хто быў там, ведае, што рака там шырокая, уся «пабітая» вірамі) патануў васьмігадовы хлапчук: ён наогул купаўся без дарослых. 12-гадовую дзяўчынку, якая прыехала пплюхацца ў запоўненым вадой кар'еры з сяброўкамі, вадалазы паднялі з глыбіні 13(!) метраў... Гэты жалобны і жудасны спіс мог бы папоўніцца яшчэ двума выпадкамі: у Гомелі з акна трэцяга паверха выпаў двухгадовы малы, а ў Гомельскім раёне з другога паверха — шасцігадовая дзяўчынка. Дзякуй Богу, дзеці не загінулі, але моцна пакалечыліся, і ад аднаго толькі ўяўлення, як балюча цяпер гэтым маленькім чалавечкам, нават у спёку працінае холад.

Як балюча іх бацькам, родным тых, што загінулі, — страшна нават думаць. Пэўна, стукае ў скроні горкая праўда, якая цяпер з імі будзе назаўжды: не дагледзелі, не засцераглі, пакінулі (няхай сабе і на некалькі хвілін) адных... Нашы дзеці па-ранейшаму — і сёння ў большай ступені, чым трыццаць гадоў назад, менавіта па віне сваіх самых блізкіх дарослых людзей — як трава пры дарозе. Нават некалькі імгненняў, калі яны сам-насам з навакольным светам — і здараецца непапраўнае. Адзіная ў жыцці сітуацыя, якую ніяк не зменіш...

Колькі яшчэ павінна з'явіцца новых маленькіх магіл, каб мы гэта зразумелі? Не чакаючы, пакуль бяда прытупае за дзіцячай труной у хату...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Запрашальнік

# У Баркалабаве — двайное свята

Невялічкі аграгарадок на Быхаўшчыне вядомы тым, што тут у жаночым манастыры з аднайменнай назвай захоўваецца арыгінал цудатворнай іконы Баркалабаўскай Божай Маці, які датуецца 1659 годам. На Беларусі ўсяго тры такія старадаўнія абразы (акрамя Баркалабаўскага, яшчэ Мінскі і Жыровіцкі. У гонар святкавання гэтай іконы арганізаваны два хрэсныя ходы — з Магілёва і Быхава, удзел у літургіі прымуць уладыка Бабруйскі і Быхаўскі Серафім і епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній. Таксама тут чакаюць шматлікіх паломнікаў з усёй Беларусі і Расіі. У гэты ж дзень адбудуцца святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 450-годдзю аграгарадка Баркалабава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ, ПЕРШЫ ПРАЦОЎНЫ...

## Камандзіры, рабочыя, меліярацыйныя таварыствы — кавалеры ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР

**Пра тое, што ў савецкія гады наша рэспубліка мела ўласную дзяржаўную ўзнагароду, якой амаль цэлае дзесяцігоддзе адзначала сваіх грамадзян, сродкі масавай інфармацыі ўспамінаюць не часта. Сёння на старонках газеты мы зноў паспрабуем прыпадняць заслону таямнічасці над першым і сапраўды ўнікальным знакам адзнакі беларускай дзяржавы — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР.**

**Існаванне ўзнагароднай сістэмы ў тым або іншым выглядзе ўласціва практычна ўсім дзяржавам. Адлюстроўваючы, захоўваючы і падтрымліваючы лепшыя векавыя традыцыі нацыі, ордэны і медалі, нараўне з Дзяржаўным гербам і Дзяржаўным сцягам, з'яўляюцца важным палітычным і нацыянальным сімвалам. У сувязі з гэтым зусім заканамернай з'явілася ўвага кіраўніцтва БССР да пытання аб уласнай узнагародзе практычна з першых жа гадоў існавання рэспублікі. Вырашылі, што першы знак узнагарод БССР будзе працоўным.**

### НАРАДЖЭННЕ ОРДЭНА

У лютым 1924 года Прэзідыум ЦВК БССР абвясціў конкурс на лепшы праект Дзяржаўнага герба. Адначасова з гэтым у вышэйшым органе дзяржаўнай улады задумаліся і аб стварэнні першай рэспубліканскай узнагароды.

Распрацоўку эскіза даверылі мастаку Генадзю Змудзінскаму. Ён быў не толькі майстрам пэндзля, які атрымаў адукацыю ў акадэміі мастацтваў па класе батальнага жывапісу, але і храбрым, умелым афіцэрам. У гады Першай сусветнай Генадзь Яўгенавіч, як і многія яго аднагодкі, апынуўся на германскім фронце, дзе камандаваў ротай і за праяўленую доблесць атрымаў чатыры ўзнагароды. Пасля рэвалюцыі Змудзінскі добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. Батальён пад яго кіраўніцтвам абараняў Петраград і прымаў удзел у савецка-польскай вайне 1920 года. За баявыя заслугі ВЦВК РСФСР узнагародзіў яго залатым гадзіннікам. У далейшым па стане здароўя Генадзь Яўгенавіч не змог працягнуць службу і прыехаў у Мінск. Працаваў мастаком у рэдакцыях газет і ў выдавецтве.

25 ліпеня 1924 года распрацаваны ім праект ордэна быў прыняты на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК рэспублікі. Малюнак і апісанне да яго захаваліся да нашых дзён. Каляровая графічная выява ордэнскага знака сведчыць не толькі пра бездакорны густ і высокае майстэрства аўтара, але і пра веданне ім гісторыі свайго краю, разуменне важнасці выкарыстання ў такой узнагародзе характэрнай для краіны сімволікі. Апошняя, па задуме мастака, павінна была адлюстроўваць найбольш распаўсюджаныя ў рэспубліцы сферы працы: фабрычная, заводская і сельскагаспадарчая, а таксама праца лесаводаў. Аснову ордэнскага знака склаў традыцыйны для беларускага рэгіёна геральдычны шчыт у выглядзе картуша чырвонага колеру.

Пасля зацвярджэння эскіза мастак прыклаў нямала энергіі для ўвасаблення свайго «дзецішча» ў метал. Паколькі ў Мінску неабходных тэхналогій не было, адліваць спецзаказ прыйшлося ў Маскве. Усяго было вырашана вырабіць 300 экзэмпляраў ордэна.

### ПРАЦОЎНЫМ УЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА ОРДЭНАМ

12 кастрычніка 1924 года друкаваны орган ЦВК БССР газета «Савецкая Беларусь» апублікавала палажэнне аб новай узнагародзе. У палажэнні гаварылася, што ордэн прысуджаецца ўсім грамадзянам БССР, якія праявілі асаблівую самаадданасць, ініцыятыву і працавітасць у вырашэнні гаспадарчых задач у вобласці паляпшэння прамысловасці, транспарту, арганізацыі сельскай гаспадаркі і іншых галін працы. У сувязі з чым першыя ордэнскія знакі ўручаліся ў асноўным рабочым і сельскім працаўнікам. Ордэнаў за № 1 і № 2 былі ўдастоены меліярацыйныя таварыствы ў сёлах Васількі Бялыніцкага і Астрэні Чавускага раёнаў. За актыўны ўдзел у сацбудаўніцтве ўзнагароду рэспублікі атрымалі прадстаўнікі заводаў «Энергія» і «Бальшавік» у Мінску, «Чырвоны металіст» у Віцебску, «Чырвоны Кастрычнік» у Мазыры, добрушскай фабрыкі «Герой працы» і іншыя. У далейшым узнагарода стала ўручацца ўдзельнікам грамадзянскай вайны і выдатным военачальнікам, якія найбольш вызначыліся.

Усе статуты (назва палажэнняў аб ордэнах, якая гістарычна склалася. — **Аўт.**) да першых савецкіх узнагарод звярталі ўвагу, перш за ўсё, на мэту або матыў іх заснавання. Не стаў выключэннем у гэтых адносінах і першы ордэн Беларускай ССР. Так, у статуце ордэна, зацверджаным 15 чэрвеня 1932 года, асобна агаворвалася, што ён «даецца ў азнаменаванне выключных заслуг у справе сацыялістычнага будаўніцтва».

Узнагароджанне ордэнам ажыццяўлялася пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР або яго Прэзідыума па прадстаўленні цэнтральных устаноў і ведамстваў рэспублікі, а таксама Цэнтральнага Савета прафесійных саюзаў. Разам з ордэнскім знакам узнагароджаным уручалася асаблівая грамата, распрацаваная ўсё тым жа мастаком Генадзем Змудзінскім. Па-майстэрску выкананы малюнак уяўляў сабой даволі складаную кампазіцыю: выява самога ордэна на фоне чырвонага сцяга, рэалістычныя вобразы беларускага рабочага і селяніна, нацыянальны арнамент, прылады працы, сплеценыя паміж сабой галінкі лаўра і каласы пшаніцы. Выкананы па цэнтры надпіс на беларускай мове звяртаў увагу на заслугі ўзнагароджанага: «Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі ў знак выпаўненыя (імярэк) свайго абавязку перад Сацыялістычнай Бацькаўшчынай на фронце Працы дае у нагароду яму знак Ордэну Працоўнага Чырвонага Штандару БССР № ... — сымболь сусветнай Сацыялістычнай Рэвалюцыі». Грамата падпісвалася Старшынёй і Сакратаром Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

У адпаведнасці са статутам ордэна, пастановы аб узнагароджанні ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР, а таксама аб пазбаўленні ўзнагароды ў абавязковым парадку публікаваліся на старонках «Савецкай Беларусі». Такія паведамленні закліканы былі стымуляваць на далейшыя працоўныя подзвігі не толькі адзначаных у друку, але і службіць магутным сродкам прапаганды дасягненняў на працоўным фронце.

Знак ордэна мацаваўся на левым баку грудзей. Яго нашэнне было абавязковым на пасяджэннях з'ездаў Саветаў, на сесіях ЦВК БССР, на афіцыйных парадах і ўрачыстых пасяджэннях, у дні рэвалюцыйных свят. З'яўляючыся ўзнагародай, якая ўручаецца ад імя дзяржавы, ордэны не маглі перадавацца іншым асобам, а таксама служыць прадметам продажу, закладу або дарэння. Знакі ордэна выдаваліся бясплатна, мелі адну ступень і за новыя працоўныя дасягненні ўзнагароджанне магло быць ажыццёўлена паўторна. Кожнаму знаку ордэна прысвойваўся асобны нумар.

У першыя гады Савецкай улады працоўны гераізм заахвочваўся не толькі маральна, але і матэрыяльна. Цікава, што на ўзнагароджаных ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускай ССР распаўсюджваўся шэраг ільгот і прывілеяў. Так, паводле ордэнскага статута, кавалеру штогод належала за кошт дзяржавы па 200 рублёў. Гэтыя выплаты, якія не абкладаліся падаткамі і адлічэннямі, рабіліся ўзнагароджаным звыш іх заработнай платы (грашовага забеспячэння ў РСЧА) або пенсіі, незалежна ад іх памераў. Для ардэнаносцаў існавалі льготы пры прыняцці іх дзяцей ва ўсе навучальныя ўстановы рэспублікі, пры ўступленні ўзнагароджаных у калгасы; права бясплатнага праезду на трамваях ва ўсіх гарадах Беларусі, зніжка на аплату жыллошчы ад 10 да 50 працэнтаў, а таксама скарачэнне на адну трэць стажу працы або службы для атрымання пенсіі.

Акрамя льгот і пераваг, узнагароджаныя ордэнамі мелі і пэўныя абавязкі. Яны абавязаны былі быць у першых радах сацыялістычнага будаўніцтва, весці актыўную грамадскую працу ў грамадскіх арганізацыях, актыўна ўдзельнічаць у спецыяльных кампаніях, звязаных з асноўнай дзейнасцю ўзнагароджанага.

### АРДЭНАНОСЦЫ

У эпоху, якая разглядаецца, кавалераў ордэна горда называлі «ардэнаносцамі». Сярод узнагароджаных можна ўбачыць прадстаўнікоў многіх прафесій. Гэта і простыя рабочы, і военачальнік, і дзеяч культуры. Раскажам коратка пра некаторых з іх.

Сіманоўскі Іосіф Бенцыянавіч — вядомы савецкі бібліёграф, перакладчык і педагог. Адзін з арганізатараў і першы дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Нарадзіўся ў сям'і рамесніка-смалакура. У 1914 годзе скончыў універсітэт у Берне. З 1918 па 1921 год — загадчык Бабруйскай гарадской бібліятэкі. Адзін з арганізатараў і ў 1922—1937 і 1944—1961 гадах дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна. У перыяд з 1937 па 1941 год — дырэктар навукова-медыцынскай бібліятэкі БССР. У 1942—1944 гадах выкладаў у Маскоўскім бібліятэчным інстытуце. У 1944—1957 — выкладчык бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Пераклаў вершы Г. Гейне і А. Міцкевіча на беларускую мову. У 1957 годзе Іосіф Бенцыянавіч быў удастоены ганаровага звання «Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР».

Сярод кавалераў ордэна заслугоўвае ўвагі таксама асоба ўраджэнца Віцебскай губерні Лазара Васільевіча Грынвальда-Мухі — актыўнага ўдзельніка грамадзянскай вайны, паплечніка будучага аса савецкай разведкі Станіслава Ваўпшасава. Сваю працоўную дзейнасць Лазар Васільевіч пачаў з 11 гадоў. Першую сусветную вайну сустрэў рабочым друкарні ў Віцебску. Пасля прызыву ў армію залічаны ў інжынерны батальён. У лютым 1918 года ўступіў у Чырвоную гвардыю, прымаў удзел у баях з немцамі ў раёне Лепеля і Полацка. У далейшым ваяваў на Паўднёвым фронце. Пасля цяжкага ранення вярнуўся ў родную Беларусь. У канцы 1919 года арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад, які дзейнічаў у Лепельскім павеце. Партызаны атрада Грынвальд-Мухі ажыццяўлялі смелыя аперацыі па нападзе на дробныя польскія гарнізоны, ваенныя ўстановы, штабы, саставы і камунікацыі сапернікa. У 1921 годзе быў накіраваны ў асобы аддзел Заходняга фронту. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны пераведзены ў пагранічныя войскі. Быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР № 159.

Сярод узнагароджаных ордэнам былі і жанчыны. Адна з іх — Вера Захараўна Харужая. Яе імя ўвайшло ва ўсе падручнікі па гісторыі Беларусі, стала сапраўды хрэстаматыйным. Актыўная дзяячка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, партызанка-падпольшчыца ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

Уручэнне ордэна працягвалася да 1933 года — пакуль не ўвялі адзіную агульнасаюзную сістэму ўзнагарод. Пры гэтым выдадзеныя раней ордэны заставаліся за ўзнагароджанымі, як захоўваліся і ўсе перавагі, прадугледжаныя статутам ордэна. Па розных звестках за дзевяць гадоў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР упрыгожыў сцягі амаль 30 працоўных і воінскіх калектываў. Каля 140 чалавек, ад простага рабочага да камандуючага войскамі, сталі называць сябе яго кавалерамі. Лёс кожнай узнагароды прасачыць даволі складана. На жаль, да нашых дзён захавалася мала экзэмпляраў «Працоўных Сцягоў». Трыма знакамі, якія ўручаліся 7-му і 10-му чыгуначным палкам, Аб'яднанай Беларускай ваеннай школе імя ЦВК БССР, валодае былы Цэнтральны музей Узброеных Сіл СССР. Два ордэны прадстаўлены ў экспазіцыі Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, яшчэ адзін захоўваецца ў калекцыі Дзяржаўнага Эрмітажа. Прысвоены ў 1932 годзе войскам пагранаховы ДПУ БССР ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга сёння па праве ўпрыгожвае сцяг нашых «зялёных фуражак». Шэраг узнагарод захоўваецца ў музейных калекцыях краіны.

...На працягу амаль цэлага дзесяцігоддзя ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускай ССР з'яўляўся найвышэйшай узнагародай рэспублікі, адыгрываючы разам з іншымі ўзнагародамі Краіны Саветаў вялікую ролю ў працоўным уздыме мас на аднаўленне народнай гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва. Сёння ён адносіцца да ліку рэдкіх узнагарод і гэта робіць яго вартым знаходзіцца ў шэрагу гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай дзяржавы.

90-годдзе першай беларускай узнагароды і 40-годдзе з дня заснавання ордэна Працоўнай Славы СССР, якія адзначаюцца сёлета, — добрая падстава задумацца над заснаваннем іх пераемніка ў выглядзе новага працоўнага ордэна Рэспублікі Беларусь, здольнага прадоўжыць лепшыя ўзнагародныя традыцыі папярэдніх пакаленняў.

**Аляксандр САМОВІЧ,**
**дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук.**

**Анатоль ВЯЛІКІ,**
**вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук.**

■ НЕэкзотыка

# «ЛЕПШАЯ АГРАЭКАСЯДЗІБА-2013»

## Мінская вобласць пакуль лідзіруе па колькасці ўдзельнікаў

**Хоць падача заявак ад сядзіб на ўдзел у конкурсе завяршаецца, цікавасць да яго ўзрастае з кожным днём.**

Па словах **галоўнага эканаміста аддзела кліенцкага менеджменту ўпраўлення карпаратыўнага бізнесу Белагропрамбанка Вячаслава ГОРБАЧА,** асаблівую цікавасць праявілі суб'екты аграэкатурызму цэнтральнага рэгіёна. Аднак да 1 жніўня яшчэ ёсць час — астатнія вобласці могуць падцягнуцца.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі банка, умовы правядзення сёлетняга рэспубліканскага конкурсу змяніліся. Цяпер суб'екты аграэкатурызму маюць права самастойна заявіць пра свой удзел пры дапамозе падачы адпаведнай заяўкі ў цэнтральны апарат ААТ «Белагропрамбанк». Конкурсных намінацый па-ранейшаму пяць, але яны набылі новы змястоўны складнік: «Лепшы старт», «Этнакомплекс», «Беларуская традыцыйная кухня», «Экасядзіба года», «Стыль і гармонія».

Акрамя спецыяльных дыпломаў, пераможцы ў кожнай намінацыі атрымаюць каштоўныя прызы і грашовыя прэміі ў памеры 75 базавых велічынь. Гранпры конкурсу — 115 базавых велічынь!

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

Фота БЕЛТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 25.08.2014 в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

## Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

**1. Помещение № 319, арендуемой площадью 21,7 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, водо- и электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 553 350 рублей; размер задатка – 55 300 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.**

**Документы на участие в аукционе принимаются с 25.07.2014 по 22.08.2014 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 22.08.2014, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с № 3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 209-91-26, (8-017) 209-92-78.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

«Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова»

Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Информация о застройщике**

Застройщик– Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь, зарегистрирован решением Министерства юстиций Республики Беларусь от 14.04.2006 г. № 185 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100265118. Адрес местонахождения: 220005, г. Минск, ул. Я. Коласа, 2.

По вопросам заключения договоров и строительства обращаться в Торгово-строительное унитарное предприятие «Олимпийские проекты», УНП 190191720 (организация выполняет функции заказчика по договору-поручению).

Адрес местонахождения заказчика: 220012, г. Минск, пр. Независимости, 80а, комната 19.

Режим работы: понедельник – четверг с 9.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 16.45, обед с 13.00 до 13.45.

Телефоны для справок: (017) 280-80-98, 287-34-84.

В течение предыдущих трех лет предприятие осуществляло функции заказчика при строительстве объекта «Штаб-квартира Национального олимпийского комитета Республики Беларусь».

**Информация о проекте строительства**

Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова расположен в г. Минске.

Начало строительства – ноябрь 2012 г., окончание строительства – март 2015 г.

24-этажное монолитно-каркасное здание со встроенными помещениями общественного назначения на 2-х этажах (административно-офисные – 1280 м², стоматологический кабинет – 80 м²), подземной гараж-стоянкой на 54 машино-места, крытой автостоянкой на 17 машино-мест, пешеходного путепровода (моста), ПНС, коммуникационного канала и трасс инженерных сетей, благоустройство территории с устройством открытой автостоянки на 40 м/мест, количество квартир – 110.

Общая площадь объекта 19329 м² (жилое здание, встроенные помещения, гараж, технические этажи). Высота типового этажа – 3 м. Проектом предусмотрены планировочные приемы, повышающие комфорт проживания (планировочное деление квартиры на гостевую и спальную зоны, балконы, кладовые, отсутствие коридоров и вытянутых в плане комнат и прихожих во всех типах квартир). На верхнем этаже – квартиры в двух уровнях. Во всех квартирах, кроме однокомнатной, предусмотрены гостевые санузлы, ванные комнаты имеют естественное освещение.

Количество секций – 1; количество квартир 110, в том числе: однокомнатных – 1; двухкомнатных – 20; трехкомнатных – 63; четырехкомнатных – 25; пятикомнатных – 1. В доме предусмотрено пять лифтов, помещение для товарищества собственников.

